РАБОТНІЦА і КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

XVIII
9892

№ 30
1933 г.

Своечасова разгарнуць масавую работу па стварэнні ў калгасах фондаў для дзіцячых устаноў

У час пасеўнай і ўборачнай кампаній гэтага года колькасць дзіцячых ясляў дасягнула 4.940 замест 3.000 у мінулым годзе, колькасць дзіцячых пляцовак дасягнула 3.325. Яслямі было ахоплена 103.588 дзяцей, пляцоўкамі—87.853.

Гэтыя дасягненні ў справе разгортвання сеткі дзіцячых устаноў, безумоўна, спрыялі таму, што значна павысіўся ўдзел калгасніц у калгаснай вытворчасці.

Зараз, калі перыод гарачых палявых работ набліжаецца да заканчэння, неабходна своечасова паклапаціцца аб замацаванні на зіму найбольшай колькасці ясляў і пляцовак для таго, каб жанчыны мелі магчымасць і зімою не адрывацца ад працы і гаспадарча-палітычнага жыцця калгаса і соўгаса, каб яны мелі магчымасць павышаць свой культурна-палітычны ўзровень.

Наркамасветы і Наркамземам складзены планы замацавання часовых ясляў у сталыя. Гэтыя планы дасланы ва ўсе раёны. Самі калгасніцы і работніцы соўгасаў павінны настойліва змагацца за выкананне гэтых планаў, дабівацца забеспячэння сталых дзіцячых устаноў добрым памяшканнем, апалам, абсталяваннем, добрым доглядам праверaных, апраўдаўшых сябе на гэтай рабоце людзей, штодзённа дапамагаючы наладжванню іх работы.

Кожная калгасніца павінна добра ведаць цвёрдую і непарушную пастанову СНК СССР і ЦК УсеКП(б), СНК БССР і ЦК КП(б)Б, і НКЗ БССР аб катэгарычнай забароне савецкім і партыйным арганізацыям „ствараць зверху другія фонды, апрача ўказаных у пастанове СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) ад 2-VIII-33 г. (насенных страхавых і фуражных)".

Такім чынам, пасля выканання калгасамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай і пасля засыпкі названых абавязковых фондаў, забяспечана права самім калгаснікам распараджацца лішкамі збожжа ў калгасах.

Гэтая пастанова партыі і ўраду разам з цвёрдым законам аб забароне ўсякіх сустрэчных планаў па збожжапастаўках і прыцягненне да суровай крымінальнай адказнасці ўсіх тых, хто парушае гэты закон—забяспечыць атрыманне кожным дабрасумленным калгаснікам і калгасніцай у сёлетнім ураджайным годзе вялікую колькасць прадуктаў.

Калгаснікі рада калгасаў звярнуліся з лістом да правадыра партыі тав. Сталіна, у якім пісалі аб сваіх меркаваннях наконт скарыстання лішкаў, бо „калгаснік павінен быць і заможным і культурным".

У сувязі з гэтым СНК СССР і ЦК УсеКП(б) вынесла пастанову ад 18 жніўня, дзе растлумачваецца, што „калі самі калгасы пажадаюць, яны маюць права пастановай агульнага схода калгаса з удзелам не менш 2/3 калгаснікаў ствараць і іншыя фонды ў калгасах, як-то: фонд на павялічэнне непадзельных капіталаў у калгасах, а таксама фонд для аказання дапамогі інвалідам, сем'ям чырвонаармейцаў, на ўтрыманне дзіцячых ясляў".

Задача ўсяго жаночага актыва—зараз-жа разгарнуць шырокую масавую работу вакол пытання засыпкі фондаў для дзіцячых устаноў, адзначаючы тое вялізарнае значэнне, якое маюць дзіцячыя ўстановы ў справе выхада калгасніц на работу, у справе павялічэння, такім чынам, колькасці рабочых рук у калгасе.

Задача ўсяго жаночага актыва—уцягнуць найбольшую колькасць сельсаветаў, калгасаў і саўгасаў у абвешчаны ЦВК БССР конкурс на большае ўцягненне жанчын-калгасніц у калгасную работу і лепшае іх бытавое абслугоўванне. Конкурс гэты, абвешчаны ў пачатку веснавой пасеўнай кампаніі, працягваецца і зараз.

Пасля сканчэння веснавой пасеўнай кампаніі, былі прэміяваны конкурснай камісіяй лепшыя калгасы і саўгасы маннай і рысам для ясляў у колькасці 9.769 кгр. і 5 тон цукеркавых вырабаў.

Зараз у распараджэнні конкурснай камісіі ёсць каля 2 тон круп і 10.000 руб. для прэміявання тых калгасаў і саўгасаў, якія выйдуць перадавымі ва ўборачнай і загатоўчай кампаніі, даб'юцца найбольшага выхада калгасніц на работу шляхам найлепшага іх бытавога абслугоўвання, якія замацуюць дзіцячыя ўстановы ў сталыя і створаць добраахвотныя фонды для дзіцячых устаноў.

Прэміі будуць выдавацца на падставе матар'ялаў, якія будуць паступаць з раёнаў у ЦВК і па матар'ялах друка.

Калгасніцы, памятайце, што нельга ўпускаць часу. Зараз-жа неабходна пачаць клапаціцца аб замацаванні сеткі дзіцячых устаноў на зіму, аб забеспячэнні іх фондамі, якія трэба ствараць у добраахвотным парадку, аб уключэнні ва ўсебеларускі конкурс на лепшае бытавое абслугоўванне калгасніц.

М—я.

Аб правядзенні ўсебеларускай сталінскай эстафеты за высокую якасць ільнаапрацоўкі, за лепшае выкананне ільназагатовак

З пастановы ЦК КП(б)Б.

У сувязі з тым, што зараз наступіў рашаючы этап у барацьбе за апрацоўку (абмалот, расціл, догляд на сцелішчы, падняцце са сцелішчаў, мяцце, трапанне) ільну і ільназагатоўкі, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Правесці з 15 верасня па 5 лістапада г.г. усебеларускую сталінскую эстафету за высокую якасць ільнаапрацоўкі, за лепшае выкананне ільназагатовак.

Асноўнай задачай правядзімай эстафеты паставіць: а) атрымаць ільнавалакно не ніжэй 8 нумара, выканаць ільназагатоўкі валакном не ніжэй 10 нумароў; б) заваяваць пяршынства ў спаборніцтве БССР з Заходняй вобласцю па апрацоўцы ільну і выкананні кантрактацыйных дагавораў з дзяржавай.

2. Прыстасаваць да вынікаў эстафеты скліканне ўсебеларускага злёта перадавых ільнаводчых калгасаў у адным з ільнаводчых раёнаў, які дасць вышэйшыя паказальнікі ў якасці ўборкі і здаваемага ільнавалакна і першым па БССР выканае ільназагатоўкі, прычым устанавіць, што права пасылкі дэлегатаў калгаснікаў-ударнікаў на ўсебеларускі злёт атрымаюць тыя калгасы, якія найлепш і без страт правядуць ільнаўборку, ільнаапрацоўку і поўнасцю выканаюць за час эстафеты загатоўкі па ільну валакном ці трастой лепшай якасці.

На вокладцы: т. **Ганчарова**, лепшая ўдарніца—брыгадзір машыннай брыгады Шчотачнай ф-кі імя Крупскай (Менск) Промфінплан выконвае на 130 проц.

XVIII 5892

Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!

Работніца і Калгасніца Беларусі

ВЕРАСЕНЬ 1933 г.

№ 30

Державна бібліотека Одеса 27 4 34

Работніцы, уключайцеся ў прэдкастрычнікаўскую пераклічку прадпрыемств

„Наяўнасць ад 50 да 70 проц. жанчын-работніц у складзе рабочых паасобных фабрык абавязвае парткалектывы і ячэйкі перабудаваць сваю работу, прыстасаваўшы ўсю сыстэму масавай работы да запатрабаванняў і асаблівасцяй паасобных груп работніц, забяспечыўшы пры гэтым усямернае павышэнне іх кваліфікацыі, паляпшэнне сацыяльна-бытавога абслугоўвання і вылучэнне работніц на кіруючую гаспадарчую, партыйную і прафесіянальную работу.

(З пастановы ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб рабоце прамысловасці).

Раней адсталая, аграрна-саматужная Беларусь дзякуючы Ленінскай нацыянальнай палітыцы партыі пры брацкай дапамозе СССР мае за час існавання Савецкай улады вялізарныя поспехі ў будаўніцтве прамысловасці. Прамысловасць тут створана занава. Пабудаваны надзвычайна добрыя фабрычныя памяшканні—цэлыя палацы прамысловасці, як, напрыклад, Віцебская трыкатажная фабрыка „КІМ", швэйная фабрыка „Сцяг індустрыялізацыі". Такімі прадпрыемствамі можа ганарыцца ўвесь Савецкі саюз. Самымі лепшымі машынамі абсталяваны гэтыя і шмат іншых прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці БССР.

А што наглядаецца? Менскія прадпрыемствы лёгкай прамысловасці выканалі за паўгоддзе толькі 87,6 проц. плана, Віцебскія—77,3 проц., Гомельскія—87,7 проц., па ўсёй прамысловасці БССР праграма выканана на 85 проц. Гэта па колькасных паказальніках.

У галіне палепшання якасці прадукцыі і зніжэння сабекошта ў нас таксама вялікія прарывы. Сабекошт замест зніжэння на 3,4 проц., вырас на 5,2 проц.

У выніку лёгкая прамысловасць БССР за паўгоддзе не дадала дзяржаве прадукцыі на 23.600 р. і панесла страт на 4—5 мільёны рублёў.

Ці ёсць якія-небудзь аб'ектыўныя прычыны, якімі магчыма было-б апраўдаць гэтыя прарывы?

Безумоўна няма. Сыравіна ёсць у выстарчальнай колькасці, умовы працы значна палепшыліся супроць мінулага года (дэкрэт урада аб барацьбе з прагуламі, дэкрэт аб перадачы забеспячэння рабочых непасрэдна ЗРК і г. д.).

У чым-жа сапраўдная прычына нашых прарываў?

Трэба адкрыта сказаць—у нашым няўменні працаваць, у нашым нежаданні вучыцца працаваць па-новаму, па-соцыялістычнаму. Шмат на якіх прадпрыемствах па-барбарску адносяцца да новых машын, не трымаюць іх у належнай чыстаце, не вывучаюць іх, адсутнічае рашучая барацьба за аўладанне тэхнікай, з прычыны чаго машыны працуюць з няпоўнай нагрузкай. Мы яшчэ не навучыліся беражліва, па культурнаму адносіцца да тэй прадукцыі, якую мы вырабляем.

У галіне барацьбы з бракам і бракаробамі ў нас шмат дэкларацыйнай балбатні і мала канкрэтных мер для таго, каб біць бракароба рублём.

Яшчэ на XVI партз'ездзе тав. Сталін сказаў: „зараз, калі мы ў асноўным выцягнулі цяжкую прамысловасць, час ужо пасапраўднаму ўзяцца,—і мы маем усе магчымасці для гэтага,—за высоўванне наперад лёгкай прамысловасці".

Пытанне аб рабоце лёгкай прамысловасці абмяркоўвалася і на XVII партыйнай канферэнцыі, на студзенскім і вераснёўскім пленумах ЦК УсеКП(б). Вычарпальнае рашэнне па дакладу наркамата лёгкай прамысловасці БССР вынёс таксама ліпеньскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б.

Неабходна зараз-жа ўсім рабочым і работніцам пасапраўднаму ўзяцца за рэалізацыю гэтых рашэнняў партыі. Трэба зараз-жа падхапіць ініцыятыву рабочых і работніц фабрыкі „Дзвіна", якія звярнуліся праз рэспубліканскія газэты да ўсіх рабочых і работніц з заклікам аб уключэнні ў перадкастрычнікаўскую пераклічку.

Рабочыя і работніцы „Дзвіны" ўзялі на сябе абавязацельствы—дабіцца да Кастрычнікаўскай гадавіны 100-проц. выканання плана, як па колькасных, так і якасных паказальніках кожным цэхам, кожнай брыгадай.

Масавае ўключэнне жанчын-работніц у прэдкастрычнікаўскую пераклічку і наогул у барацьбу за якасць прадукцыі, за аўладанне тэхнікай, мае асабліва важнае значэнне. Амаль на ўсіх прадпрыемствах лёгкай прамысловасці жанчыны складаюць пераважную большасць.

Жанчына—спажывец асабліва адчувае тыя недахопы, з якімі нашы прадпрыемствы выпускаюць вопратку, абутак і іншыя тавары.

Жанчыны-работніцы, дэлегаткі і актывісткі, вы павінны з'явіцца перадавымі барацьбітамі за чыстыя, прыгожыя цэхі, за добрасумленныя гаспадарскія адносіны да машын, за добрасумленныя таварыскія адносіны да працоўных, якія будуць карыстацца выпрацаванай вамі прадукцыяй.

Ніводнай брыгады, ніводнага цэха без 100-проц. выканання плана, як па колькасных, так і па якасных паказальніках, ніводнага бракароба на прадпрыемстве, новая хваля соцспаборніцтва, новыя ўдарныя брыгады—вось чым павінна лёгкая прамысловасць БССР сустрэць 16 гадавіну Кастрычніка.

Дзякуючы перабудове працы з адсталых у перадавыя

Ліпеньскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б паставіў цэнтральнай задачай перад прамысловасцю БССР барацьбу за неадкладную ліквідацыю прарыва ў выкананні прамфінплана. На канцэнтрацыю ўсіх партыйных сіл, на ўмацаванне нізавых партыйных звеняў, за ўзняцце палітычна-масавай работы ў цэхах, партгрупах, з тым, каб кожнага комуніста, беспартыйнага, кожнага рабочага-ударніка зрабіць сапраўдным арганізатарам вытворчага жыцця.

Новае парткіраўніцтва фабрыкі „Дзвіна" ў аснову сваёй штодзённай практычнай работы паклала апошняе рашэнне пленума—100-проц. выкананне і перавыкананне прамфінплана. Павялі жорсткую барацьбу на ліквідацыю прарываў, правільна расставілі партыйныя і беспартыйныя сілы па цэхам, зменах і брыгадах. Пераключылі па-новаму ўсю работу фабрыкі.

Раней фабрыка з кварталу ў квартал недавыконвала прамфінплан, мела вялікую запазычанасць перад дзяржавай. Цяпер, пасля прынятых раду канкрэтных мер з боку ГК КП(б)Б, ёсць добрыя вынікі. За апошні час прамфінплан на фабрыцы выкананан на 102 проц. Прадукцыйнасць працы кожнай работніцы ў сярэднім складае 97 проц., зніжэнне сабекаштоўнасці на 5,5, а па плану — 7,5 проц. Узорнай стала работа гаспадарча-разліковых брыгад, якія штодзенна займаюцца сустрэчным планаваннем.

Вось брыгада групы Б матальнага цэху Базылёвай (яна-ж і парторг), якая штодзённа выконвае план на 107 проц. Пасобныя ватэршчыцы—ударніцы як Марчанка Марыля, Казлоўская А., Цімашэнка Г., героі першай пяцігодкі—Бараноўская, Сідарава і інш. выконваюць прамфінплан на 115—125 проц. Усе гэтыя ўдарніцы канчаткова ліквідавалі брак і не маюць ніводнага прагула і спазнення. Усіх ударніц і герояў першай пяцігодкі на фабрыцы „Дзвіна" не пералічыць.

З колькасці больш 2.000 рабочых налічваецца каля 800 праверaных лепшых ударнікаў. Сярод ударнікаў два разы ў месяц праводзіцца культурна-выхаваўчая работа—злёты і канферэнцыі. Сталоўка добра абслугоўвае рабочых усіх змен, абеды смачныя і танныя—каштуюць 50—70 кап. Для ўдарнікаў і герояў пяцігодкі ёсць асобныя сталы і кормяць іх добра, кожны рабочы паспявае паабедаць за 10—15 хвілін. Сталоўка чыстая і светлая. На кожнай змене пры выдачы абедаў дзяжурыць рабочы кантроль.

Цікава тое, якім чынам рабочыя „Дзвіны" так хутка атрымалі перамогу ў выкананні і перавыкананні прамфінплана. Гэта тлумачыцца тым, што партгрупы добра кіруюць работай кожнага варштата. Шырока разгорнута масавая работа. У час абедзеных перапынкаў штодзённа праводзяцца гутаркі з рабочымі і работніцамі на розныя палітычныя тэмы. Ёсць дасягненні ў справе барацьбы за эканомію. Шпулькі, якія раней валяліся па цэхах і выкідаліся ў вялікай колькасці, зараз захоўваюцца работніцамі па ініцыятыве ватэршчыцы Бараноўскай. Дэлегацкія пункты распачалі сваю работу з новымі работніцамі, якія нядаўна прышлі на фабрыку. Па-другое, для рабочых і работніц створаны належныя бытавыя ўмовы; сталоўка па-ўдарнаму абслугоўвае рабочы калектыў. Кожная работніца фабрыкі па пастанове агульнага схода рабочых павінна адпрацаваць на прыгароднай гаспадарцы—10 дзён. Аднак многія работніцы - ўдарніцы выпрацавалі ўжо па 14 (Сідарава), 18 (Ерачкіна) і інш.

Але-ж побач з дасягненнямі на фабрыцы ёсць яшчэ шмат недахопаў. Працдысцыпліна не на належнай вышыні. Наглядаюцца выпадкі з боку паасобных работніц, як Карпянковай з групы Б і асобных часальніц, якія кідаюць работу за 5—10 хвілін да абедзенага перапынка. Недастаткова вядзецца барацьба за ўшчыльненне рабочага 7-гадзіннага дня.

З боку табельшчыкаў вядзецца дрэнны ўлік норм выпрацовак работніц. Вось прыклад: ударніца Лебедзева Варвара групы „Б", стара-істужкавага цэху, 25-VIII выпрацавала 21 нумар, а запісалі 15 нумароў. Работніца бантаброшчыца—машына № 15—20-VIII выпрацавала 25 здымак, а запісана—15. Такіх фактаў няўважлівых адносін табельшчыкаў можна знайсці шмат.

На чале з новым парткіраўніцтвам фабрыкі рабочыя і работніцы мабілізуюцца на выкананне і перавыкананне прамфінплана, на ліквідацыю запазычанасці, якая была ў мінулых кварталах.

Зараз фабрыка „Дзвіна" выклікала ўсе прадпрыемствы БССР на перадкастрычніцкую вытворчую пераклічку па лепшай рэалізацыі пастановы ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК.

На гэты заклік павінны адгукнуцца ўсе фабрыкі і заводы БССР.

Таня.

Віцебск.

Ударніцы швейнай ф-кі „Сокол" арганізавалі суботнік па шыццю бялізны для дзіцячых ясляй падшэфнага калгасу „Победа"

Лепшыя повары-ўдарніцы: 1) Тав. Крэчко Ганна, 2) тав. Скуратовіч, 3) Чайкоўская Ліза.

ІНЖЫНЕРЫ ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ

Каля вітрыны ўдарнікаў увесь час расце людскі натоўп, кожнаму цікава хто лепшы і за што папаў на гэта пачэснае месца. На першым месцы вітрыны фотаздымак старэйшага повара 11 дыетсталовай Крэчко Ганны.

Тав. Крэчко з 1920 года працуе поварам, спачатку малодшым, потым намеснікам старэйшага, а цяпер старэйшым поварам. Работа ў дыетычнай сталоўцы вельмі складаная, бо тут харчуюцца розныя хворыя і для кожнай групы трэба гатаваць асобныя стравы.

Страва ў Ганны згатавана заўсёды смачна, рознастайнае меню. Рабочыя вельмі задаволены работай Ганны, няма ніводнай скаргі на дрэнную якасць згатаванай стравы, не было ніводнага выпадка браку. Санітарыя ў сталоўцы таксама пастаўлена ўзорна, што адзначыў доктар Кутоўскі, які яе абслугоўвае.

За ўдарную работу Ганна прэміявана 4 разы, з іх два разы курортам.

Тав. Скуратовіч яшчэ зусім маладая дзяўчына—комсамолка. У 1931 годзе яна прышла ў сталовую АДПУ вучаніцай. Але за гэты кароткі час тав. Скуратовіч здолела аўладаць тэхнікай поварскай справы і цяпер працуе на самых кваліфікаваных работах, нават спраўляецца з работай старэйшага повара. Тав. Скуратовіч не ведае брака. За ўдарную работу яна некалькі разоў прэміявана. Найлепшая вылучэнка з моладзі, комсамолка Скуратовіч—гонар сталовай АДПУ.

Чайкоўская Ліза вельмі маладая—нарадзілася ў 1913 годзе. У 1932 годзе скончыла ФЗУ кулінараў і зараз працуе памочнікам старш. повара сталоўкі друкарні імя Сталіна. На працу ніколі не спазнялася, браку не рабіла, да рабочых адносілася добра, свае абавязкі выконвала сумленна—вось кароткая характарыстыка Лізы.

***

Менскі агульна-гарадскі злёт павароў, трыкутнікаў сталовых, бракеражных камісій і інш. адчыніўся дакладам тав. Багарад Сары (Старшыня ЦК саюза грамадскага харчавання).

— Сетка сталовых па БССР зараз значна выросла. Калі ў 1931 г. мы мелі сталовак 189 з сутачнай прапускной здольнасцю ў 144 тысячы блюд і з зваротам у 32 млн. руб., то ў гэтым годзе мы маем 500 сталовак з сутачнай прапускной здольнасцю у 375 тысяч блюд і зваротам у 70 млн. р.

У 1933 годзе павялічыўся таксама ахоп вучняў і студэнтаў. Сталовымі ахоплена 85 тысяч школьнікаў і 36809 студэнтаў. Па сельскай сетцы ў час пасеўнай і ўборачнай па саўгасах і МТС працавала 406 сталовак, 984 часовых пунктаў грамадскага харчавання, 78 развозак палявога харчавання і 68 чайных.

Разам з гэтымі дасягненнямі ёсць яшчэ вельмі шмат недахопаў у галіне грамадскага харчавання. Ёсць і шмат злачынств. Павялічыліся растраты. Толькі за пяць кварталаў па БССР растраты складаюць 193 тыс. рублёў. Прадпрыемствы вельмі дрэнна змагаюцца за сваю ўласную харчовую базу. Шмат дзе ў нядбайным становішчы знаходзяцца свінарнікі, трусятнікі, кепска праводзяцца самазагатоўкі. Адсутнічае работа з паварамі і кантроль над імі. Чаго варты такі факт, што ў сталоўцы дома ўрада сістэматычна выпісваліся цукеркі для прыгатавання... мяснога супа, а дзе яны дзяваліся не вядома.

Па закранутых тав. Багарад пытаннях разгарнуліся спрэчкі.

Сцепанюк — повар жанчына, сталоўкі „Камунар“ адзначыла цэлы рад недахопаў у рабоце сваёй сталоўкі.

— Нас атакуюць прусы, яны проста падаюць у талеркі, а іх-жа можна лёгка знішчыць. Але гэтым ніхто не займаўся, тут і наша віна. У час падрыхтоўкі да злёту мы набылі недастаючую колькасць талерак, новую мясарубку, бульбаачыстку. Гэта толькі частка ліквідаваных недахопаў, а наперадзе яшчэ вялікая работа.

Недахопы прымушаюць нас сур'ёзна папрацаваць над пытаннем работы сталовак.

Прадуктаў зараз хапае—трэба толькі іх добра згатаваць і ў найлепшым выглядзе падаць на стол рабочага. У гэтым галоўную ролю грае повар. Не здарма-ж мы яго завем інжынерам грамадскага харчавання. Трэба раўняцца па лепшых паварах ударніках — т. т. Крэчко, Скуратовіч, Чайкоўскай рыхтаваць тысячы такіх повараў-ударнікаў. Злёт шляхам разгортвання крытыкі і самакрытыкі даў значны зрух у перабудове работы сталовак Менску тварам да рабочага спажыўца.

Менск. А.

У час чысткі арганізавалі новыя ўдарныя брыгады

Чыстка партыі праходзіць ва ўмовах абвостранай класавай барацьбы, якая тут прымае розныя найбольш тонкія формы (змовы, сабатаж супроць чысткі, спробы кампраментацыі лепшых комуністаў). Значная колькасць чужых, варожых элементаў пралезлі ў рады партыі.

Наша партыя, пад непасрэдным кіраўніцтвам ленінскага ЦК, на чале з т. Сталіным, вяла і будзе весці жорсткую барацьбу з апартуністамі, двурушнікамі і перараджэнцамі з партбілетамі ў кішэні.

Там, дзе парт'ячэйкі па-большэвіцку кіруюць работай—там ёсць ўзорныя прыклады барацьбы за заможны калгас. Вось прыклад у Роста-Сялецкай парт'ячэйцы, Аршанскага раёна, ў калгасе „Новы свет" у дні чысткі партыі падалі заявы аб ўступленні ў калгас 18 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і па ініцыятыве калгасніц арганізаваны ўдарныя брыгады па апрацоўцы ільна.

Чыстка партыі выклікала вялікі ўздым творчай актыўнасці жанчын-калгасніц у радзе сельсавецкіх ячэек. Так, у Харпаловічскай ячэйцы, Бабруйскага раёна, сярод 250 чалавек, якія прысутнічалі на сходзе па чыстцы партыі, было 130 жанчын.

У калгасе „Шлях Леніна", вёскі Дзіткавічы, калгасніцы выкрылі старшыню сельсавета Зайцава, які аказаўся сынам былога графа і пралез у партыю. Вось другая фігура гэтай-жа ячэйкі—Назараў, які зросся з кулацкімі агентамі, пакрываў кулакоў. Зайцаў і Назараў выключаны з радоў партыі.

У Бартнёўскім сельсавеце (Бабруйск) калгасніца Лебедзева і іншыя выкрылі старшыню калгаса Лаўрэнева—сына кулака, які хаваў сваё соцыяльнае паходжанне ад партыі. Бацька яго выкінут з калгаса. Будучы старшынёй калгаса, Лаўрэнеў выключаў з калгаса беспадстаўна беднякоў і дапусціў пашырэнне прысядзібных вучасткаў да двух гектараў. Камісія па чыстцы выкінула Лаўрэнева з радоў партыі. На сходзе па чыстцы партыі жанчыны Харпаловічскай ячэйкі абвясцілі суботнік і штурм па ліквідацыі прарыва ва ўборцы ўраджаю. На суботніку быў стопроцантны выхад калгасніц, а таксама ўдзельнічала і шмат аднаасобніц.

Можна прывесці шмат прыкладаў, калі калгасніцы прыходзілі на чыстку партыі за 7—9 кілометраў (Міхалеўскі сельсавет). Не было ніводнага схода па чыстцы, на якім не прысутнічала-б 100—150 жанчын у сярэднім.

У час чысткі выяўлен вялікі актыў калгасніц-комуністак, добра палітычна падрыхтаваных і якія на справе ўмеюць праводзіць лінію партыі на вёсцы. Так, у Васоўскай ячэйцы (Бабруйск) калгасніца Лемяшок Каця аказалася больш палітычна пісьменнай, чым сакратар парт'ячэйкі і старшыня сельсавета. Лемяшок працуе на адной з лепшых у раёне свінатаварнай ферме.

У Мазырскім раёне, Ганцоўскім сельсавеце, у час чысткі жонкі выкінутых кулакоў навучылі бяднячак, каб скампраментаваць адданых, сумленных комуністаў, Шалайко і Паплаўскага, якія добра выконваюць усе палітычна-гаспадарчыя кампаніі. Але-ж ворагі атрымалі зараз-жа адпор з боку прысутнічаючых калгаснікаў.

Раённая камісія па чыстцы (Бабруйск) выявіла рад лепшых, правераных комуністак работніц і калгасніц, якія могуць быць вылучаны на адказныя работы, але дрэнна тое, што асобныя раённыя работнікі РК КП(б)Б (т. Гофман) дрэнна адносяцца да вылучэнства. На запытанне члена камісіі па чыстцы, як праходзіць справа з вылучэнствам, т. Гофман адказаў, што з гэтай справай не трэба спяшацца, „бо не вам прыдзецца працаваць".

Чыстка партыі мае выключнае значэнне і павышае авангардную ролю кожнай комуністкі і комуніста ў барацьбе за выкананне гаспадарча-палітычных задач, у барацьбе за паляпшэнне марксісцка-ленінскага выхавання комуністаў.

Кожная калгасніца, кожная работніца і бядняцка-серадняцкія масы жанчын павінны прыняць актыўны ўдзел у чыстцы нашай партыі, з тым каб дапамагчы камісіі па чыстцы выкрыць усіх класавых ворагаў і перараджэнцаў з партбілетамі ў кішэні, каб у часе чысткі дабіцца палепшання якасці работы па ўсіх вучастках, палепшання палітыка выхаваўчай работы сярод калгасніц і калгаснікаў.

Таня.

Цяпер я ведаю, што ненаведванне партшколы — не варта партыйца

А 12 гадзіне дня, калі гудок сваім хрыплым голасам абвясціў рабочым, што пара ісьці абедаць, амаль кожны рабочы, ідучы ў сталоўку, спыняўся каля дзвярэй і чытаў спіс тых, хто сёння будзе праходзіць чыстку. Сярод іншых у спісе была і Блакоціна.

— Вы жанчыны абавязкова прыходзьце сёння на чыстку,— гаварыла работніцам жанорг Разаля,—і абавязкова выступайце ў спрэчках.

Каля варштата стаяла Блакоціна. Чаўнок выбіваў дроб, але стуку Блакоціна не чула. Яна ўспамінала сваё батрацкае жыццё. Літва, бацька памёр. Яна пападае ў час грамадзянскай вайны ў тагачасны Петраград, батрачыць там, пасля працуе санітаркай у бальніцы Копысі, а далей работніцай ткачыхай. Паступіла на фабрыцы ў кандыдаты партыі, акунулася ў грамадскую работу. Выйшла замуж, з'явіліся дзеці. Ясляў не было. Тут яна ўспомніла, што слаба наведвала партыйную школу, нават газэт не чытала, бо „не было часу"—так адказвае яна сабе.

Некалькі соцен пар вачэй пазірала на Блакоціну, калі яна расказвала пра сваё жыццё. Пытанні бадзёрылі яе, яна стаяла перад камісіяй, як і некалькі гадзін таму назад за варштатам, смела адказвала на запытанні аб рабоце на вытворчасці і свайго жыццяпісу. „Чаго палохацца, думала Блакоціна. На вытворчасці я ўдарніца, была прэміявана". Калі-ж пачалі задаваць палітычныя пытанні, Блакоціна на кожнае адказвала—не ведаю.

У разгорнутых спрэчках выявілася, што тав. Блакоціна слаба палітычна пісьменная, партзаняткаў амаль зусім не наведвала, але і бюро парткалектыва зусім не стварыла ўмоў для вучобы тав. Блакоцінай і мала цікавілася яе становішчам.

Пасля чысткі тав. Блакоціна сказала: Цяпер я ведаю, што ненаведванне партшколы не варта партыйца. І тут жа дала слова вучыцца і добра вучыцца.

Аршанскі раён. С. Мяжэвіч.

Чыстка яшчэ больш узмацніць рады партарганізацыі

Барысаўская запалкавая фабрыка „Пролетарская перамога“ прышла да чысткі партыйных радоў з выкананнем прамфінплана за першае паўгоддзе на 100 проц. У ліпені месяцы ў час чысткі яшчэ больш узняўся вытворчы энтузіязм рабочага калектыва і прамфінплан за гэты месяц выканан на 105,5 проц.

Узорныя прыклады барацьбы за якасць паказалі партгрупы аўтаматнага і каробачна-эціківачнага цэхаў. Парторгам апошняга цэха з'яўляецца тав. Нарбут Браніслава — лепшая ўдарніца, герой першай пяцігодкі. Загадчыкам цэха працуе адданая камуністка, герой пяцігодкі Баранбаум.

Аўтаматны цэх, загадчыкам якога з'яўляецца комуністка, лепшая ўдарніца тав. Гаспадарчык, таксама працуе ўзорна. Аўтаматны і каробачна-эціківачны цэхі заўсёды перавыконваюць прамфінплан і даюць лепшую якасць прадукцыі.

Чыстка паказала, што калектыў у асноўным здаровы. Ёсць добры актыў комуністак—лепшых ударніц, якія змагаюцца за якасць, за выкананне вытворчых планаў, за вучобу, якія сапраўды вядуць за сабой масы работніц. Гэта т.т. Нарбут, Гаспадарчык, Баранбаум, Кепен, Рохіна, Патаповіч і рад іншых таварышоў.

Побач з гэтым, чыстка выявіла цэлы рад недахопаў і прарываў, асабліва па партмасавай рабоце і марксысцка-ленінскай вучобе. За апошні час, праўда, палепшылася наведванне школ і гурткоў, але якасць вучобы была вельмі нізкая,—гэта паказаў ход індывідуальнай чысткі членаў і кандыдатаў партыі.

Партком Бярэзінскага камбіната, у які ўваходзіць ячэйка фабрыкі „Пролетарская перамога“, у 1931 годзе з невыстарчальнай уважлівасцю падышоў да прыёма ў партыю. Прымаліся агулам, пад шумок. У выніку гэтага, значная частка членаў і кандыдатаў партыі аказаліся зусім непадрыхтаванымі, нездольнымі насіць званне комуніста. Гэта ў большасці напісьменныя, або малапісьменныя па агульных і палітычных ведах рабочыя і работніцы. Шмат хто нават не ведаў, да якой яны партыі належаць (Лютарэвіч, Маціеўская), не ведаюць праграмы і статута.

Прымаліся ў партыю такія рабочыя і работніцы, якія яшчэ не мелі гадавога рабочага стажа. Гэта людзі адсталыя, якія нічым не адрозніваюцца ад беспартыйнай масы, часта яны пляліся ў хвасце (Радашкевіч Надзя і інш.), не наведвалі партсходаў, вучобы, месяцамі не плацілі членскіх узносаў, не разумеючы асноў партдысцыпліны.

Усё гэта паказвае, што партыйны камітэт слаба праводзіў палітыка - выхаваўчую работу з кандыдатамі і маладымі членамі партыі (большасць членаў партыі з 1932 г.).

На фабрыцы 70 проц. жанчын, але гэта не ўлічвалася парткомам Бярэзінскага камбіната. Палітвыхаваўчая работа сярод жанчын была пастаўлена слаба, дэлегацкія сходы не разгарнулі сваёй работы.

Слаба было пастаўлена інтэрнацыянальнае выхаванне рабочых і работніц, не было глыбокага растлумачэння ленінскай нацыянальнай палітыкі.

У справе рабочага забеспячэння было шмат перабояў. Адазел рабочага забеспячэння, які арганізаваны на фабрыцы „Пролетарская перамога“ замест ЗРК, яшчэ не разгарнуў як належыць работу па лепшым забеспячэнні рабочых. З прычыны слабага разгортвання самазагатовак і несвоечасовага атрымання прадуктаў былі перабоі ў забеспячэнні прадуктамі сталоўкі. Санітарнае становішча сталоўкі далёка нездавальняючае. У сталоўцы былі факты разбазарвання прадуктаў і невыдачы рабочым поўнай нормы хлеба.

У сваіх вывадах правярком даў цэлы рад прапаноў Бярэзінскаму камбінату аб перабудове ўсёй партыйнай, профсаюзнай і гаспадарчай работы, асабліва звярнуць увагу на ўмацаванне нізавога звяна (змена, цэх, брыгада) больш вытрыманымі комуністамі.

Праверком прапанаваў палепшыць партвучобу, асабліва ўцягнуць у яе жанчын, правяраць чытанне газэт членамі і кандыдатамі партыі, кожны месяц праводзячы палітбаі, а таксама ўзмацніць інтэрнацыянальнае выхаванне, асабліва сярод жанчын.

Правярком даў цэлы рад указанняў адносна паляпшэння рабочага забеспячэння.

Ударым па зажымшчыках самакрытыкі

У першы дзень чысткі ячэйкі фабрыкі „Чырвоны тэкстыльшчык“ вельмі актыўна выступалі работніцы і моцна крытыкавалі работу бюро ячэйкі. На другі ж дзень чысткі работніцы чамусці не жадалі выступаць. Камісія па чыстцы звярнула на гэта ўвагу, стала высветляць прычыны. Аказалася, што тут меў месца факт зацiска самакрытыкі з боку кандыдата партыі Радашкоўскай, якая аблаяла ў цэху работніцу Пэўзнер, за тое, што яна ў спрэчках указала на недахопы У яе рабоце.

Вакол гэтага факта была мабілізавана ўвага ўсіх партыйцаў, комсамольцаў і беспартыйных. Пытанне гэта было абмеркавана на бюро парт'ячэйкі, на агульным адчыненым партсходзе, дзе моцна ўдарылі па Радашкоўскай за зажым самакрытыкі.

Пасля гэтага зноў павысілася актыўнасць работніц у час чысткі. На сходах гаварылі аб наяўнасці сямейнасці ў бюро ячэйкі.

У час чысткі выяўляецца слабая палітычная падрыхтоўка членаў і кандыдатаў партыі, што сведчыць аб слаба пастаўленай ў ячэйцы палітвыхаваўчай рабоце.

Рабкорка.

Менск.

За здаровага калгаснага каня

Разам з машынізацыяй сельскай гаспадаркі вялікую ролю ў нас зараз адыгрывае конь. Ад яго ўтрыманьня, ад яго догляду ў значнай ступені залежыць працадзень калгасніка. На гэтым асабліва завастрыў увагу Міхаіл Іванавіч Калінін, які прысутнічаў на ўсебеларускім злёце конюхаў-ударнікаў.

Барацьба за заможнасць у калгасе патрабуе, як сваёй неабходнай умовы, добрага каня, добрага конскага пагалоўя, добрага малочнага стада, — кажа тав. Калінін. Зусім зразумела, што догляд каня ў калгасе нельга даручыць першаму сустрэчнаму, а толькі выпрабаваным людзям, якія адданы калгаснай справе. Конюхам павінен быць сапраўдны ўдарнік калгаснай вытворчасці.

Нам патрэбен культурны конюх, які ведае і любіць каня. Конюх, які не на словах, а на справе з'яўляўся-б цэнтральнай фігурай у калгасе — вось як паставіў пытанне Міхаіл Іванавіч перад злётам, а значыць і перад усімі конюхамі Беларусі.

* * *

Хадосю Баршчанкову на першы ўсебеларускі злёт калгасных конюхаў-ударнікаў паслалі калгаснікі з калгаса „Першае мая", Магілеўскага раёна. Яны паслалі яе, як старэйшага конюха ў калгасе, які выратаваў конскае пагалоўе калгаса ад гібелі.

— Страх глядзець было на коняй, калі я першы раз прышла на канюшню,—расказвае т. Баршчанкова. Схудалыя, адны рэбры тырчэлі, вошы аж кішэлі, некаторых прыходзілася нават падымаць. У чым справа,—думала я. Здаецца і сена хапае і прыкормка ёсць. У суседніх калгасах, здаецца, коняй таксама кормяць, і столькі-ж працуюць, але коні выглядаюць лепш. Пачала прыглядацца да людзей, якія працуюць поплеч са мною, прыслухоўвацца да іх.

Старшыня ЦВК СССР М. І. Калінін.

За кароткі час прышлося зняць дваіх. Адзін аказаўся ворагам, які прабраўся на канюшню з мэтаю шкодзіць. Другога прышлося зняць за нядбайную работу. Паставілі на канюшню сумленнага, працавітага калгасніка Якушу. На стайні сталі парадкі зусім другія. Кармілі коняй 6 разоў на дзень. Тры разы паілі цеплаватай вадой. Зрабілі ў канюшні вокны, пазатыкалі дзіркі Пачалі чысціць коняй і станкі Глядзіш, дзе тая худзіна дзелася—коні сталі вясёлыя, гладкія. І вясеннюю пасеўную мы сустрэлі з добрымі, падрыхтаванымі коньмі.

Вясною мяне прэміявалі, далі 6 метраў тканіны і хустку.

Зараз у мяне ўсяго 40 коняй. З дзесяці кабыл—пяць жарэблыя, пяць маладых матак пакрыта завадскім жарабком. Тры жарабкі гадуюцца асобна для Чырвонай арміі. Усе коні ў мяне вышэй сярэдняй ухарчаванасці, няма ніводнага хворага, пакалечанага. Вось мае дасягненні,— скончыла т. Баршчанкова. Крыху пазней дабавіла, — кепска толькі, што я няпісьменная, а конюхі ў нас абавязкова павінны быць людзьмі пісьменнымі, ведаць ветэрынарыю. Я ў гэтым годзе пайду абавязкова вучыцца.

З калгаса імя Пакроўскага (Дзержынскі раён) на злёт прыехала маладая дзяўчына і яшчэ маладзейшы канюх Аміля Калечыц.

— Хто яе будзе слухаць, хіба яна што разумее ў конях, загуляецца дзе-небудзь на вячорцы, вось табе і ўсё,—шапталі пра Амілю старыя конюхі, каб яна не чула. Аміля хоць і не чула, але адчувала гэта. І ўсё-ж, не зварочваючы ўвагі, моцна бралася за работу.

Калі раней коні абдзіралі сабе спіны з-за таго, што збруя не падагнана, то зараз хамуты і вупраж пранумараваны і падагнаны. Калі канюхі ўбачылі добрую работу Амілі, яны ўжо змянілі свае размовы.

Усяго 6 месяцаў, як Аміля працуе старшым конюхам разам з трыма старымі конюхамі, якія яе цяпер вельмі паважаюць за адданасць справе. Акрамя непасрэднай работы на канюшні, канюхі, прыцягваючы актыў калгасніц і калгаснікаў, павінны сачыць за тым, каб класавы вораг не пралез на канюшню, не рабіў там свае агідныя справы. Бо кулак імкнецца падарваць іменна конскую гаспадарку, ведаючы, што ад здаровага каня ў значнай меры залежыць паспяховасць сельскагаспадарчых работ.

А.

Менск.

Старшы конюх, намеснік старшыні калгасу „Чырвоная зорка" Мусіцкага с-с., Слуцкага раёну.

Рашуча дабівацца палепшання работы ясляў

Замацаваць найбольш ясляў на зіму. Своечасова паклапаціцца аб стварэнні ясельных фондаў

Абязлічка павінна быць ліквідавана

Дырэктывы партыі і ўрада аб адчыненьні дзіцячых устаноў у калгасах на час летніх работ (сяўба, праполка, ўборка) і забеспячэнне добрай іх работы па Лепельскаму раену выканана аднабакова. У Лепелі пагналіся за колькасцю і, праўда, план дзіцячых устаноў колькасна перавыканан. Замест планавых 140 дзетустаноў (яслі, пляцоўкі) па раёну арганізавана 166, з іх 103 камбінаваных ясляў і 63 пляцоўкі. Але якасць работы дзетустаноў прымушае жадаць шмат лепшага.

Як правіла, у яслях брудна, душна, кіслы пах дзіцячых полак (яслі брыгады Халімонава, калгас „Чырвонаармеец", Борауна, „6-ты з'езд Саветаў"). Нянькі гавораць, што не можна адчыняць форткі, бо, бачыце, дзеці прастудзяцца. Нават сама загадчыца ясляў калгаса „Чырвонаармеец", брыгады Халімонава, сцвярджае гэта самае. Аптэчак у яслях няма (калгас імя Калініна, „Чырвоны сцяг", „Комінтэрн" і інш.).

Да рэчы, трэба сказаць і аб райздраве тав. Кубышкінай. Яна зусім не ведае сапраўднага становішча ясляў, яна лічыць, што яслі калгаса „Комінтэрн" (Каменскі сельсавет), працуюць добра, а на справе гэтыя яслі працуюць няспраўна, зусім не абсталяваны, на 35 дзяцей ёсць толькі 4 ложкі. Было некалькі перабояў з-за неналаджанасці забеспячэння прадуктамі. І ўсе гэтыя непаладкі атрымоўваюцца з прычыны адсутнасці кіраўніцтва яслямі. Ложкі былі у яслях другой брыгады, якія даўно зачынены, таксама хапала матар'яла, каб зрабіць новыя, толькі трэба было камусці паклапаціцца, арганізаваць гэту справу.

Перабоі у рабоце ясляў, з прычыны несвоечасовага водпуска прадуктаў, з'явішча досыць частае (калгасы „Чырвонаармеец", „Авангард", імя Калініна, „6-ты з'езд" і інш.), але Райздраў нават пальцам не крануу, каб праз Райза і іншыя кіруючыя раённыя арганізацыі прымусіць праўленні калгасаў стварыць належныя ўмовы для іх работы.

Недапушчальна адносіцца праўленне калгаса „Авангард" (Песінскі сельсавет) да ясляў. За усё лета існавання ясляў нават не маглі зрабіць кручкоу для вакон. У яслі лазяць усе, хто захоча. І ня дзіва, што кражы у яслях „Авангард" сталі звычайным з'явішчам.

У яслях існуе поўная абязлічка ў доглядзе дзяцей. Усе нянькі глядзяць за ўсімі дзяцьмі. І атрымоўваецца так, што ніводная з іх за дзяцей не адказвае. Калі паб'ецца дзіця, ці што іншае з ім здарыцца, то тады віну адна на другую звальваюць. Гэта абязлічка дае магчымасць нянькам адлучацца ў час работы, адпачываць на печы (калгас імя Калініна). Акрамя гэтага, пры такой сістэме працы атрымоўваецца, што дзеці дашкольнага узроста застаюцца па-за кіраўніцтвам з боку дашкольнага інспектара, бо гэта-ж, бачыце, яслі, якімі павінен кіраваць раяздраў.

У праверaных 20 яслях з дзяцьмі не вядзецца ніякай выхаваучай работы. Прыемным выключэннем з'яуляюцца яслі цэнтральнай брыгады калгасу „Чырвонаармеец", дзе дзеці ведаюць шмат спеваў, самі наладжваюць калектыуныя гульні. Відаць, што з імі працавалі. Загадчыца гэтых ясляў мае вопыт у рабоце, працуе ўжо трэці год.

Яслі яшчэ будуць працаваць цэлы месяц, а некаторыя з іх застаюцца на зіму. Трэба, каб Райздраў разам з РайАНА ліквідавалі абязлічку у доглядзе дзяцей. Дзеці павінны быць падзелены на групы і за кожнай групай замацаваны нянькі. Групы дашкольнага ўзроста павінны адпысці пад нагляд РайАпА. Часцей трэба практыкаваць выязды сандактароу для інструктажа працаунікоу у галіне санітарнага становішча ясляу.

Трэба перагледзіць склад няняк тых, якія кормяць дзяцей суслай (калгас Борауна, імя Калініна) і зараз-жа звольніць з работы. Райздраў і РайАНА павінны ведаць, што колькаснае выкананне плана дзетустаноў павінна спалучацца з добрай якасцю іх работы. Інакш, грош цана такой рабоце.

Менск. В. Б.

Да конкурса на лепшае бытавое абслугоўванне калгасніц

Ліквідавалі абязлічку

Нашы яслі (Калгас імя Калініна) арганізаваліся ў маі месяцы. Праца ішла з невялікімі перабоямі. Прычыны перабояў—харчаванне. Пасля таго, як мы на агульным сходзе калгасніц уключыліся ў конкурс на лепшыя бытавыя ўстановы, работа пашла лепш. Яслі працуюць без перабояў. Есць хлеб, бульба, крупы, малако, цукар. Кожны дзень яслі наведвае 25—30 дзяцей ад 6 месяцаў і да 5 год. Шасцігодак мы у яслі не прымаем, бо вельмі цеснае памяшканне. З уключэннем у конкурс мы асабліва пачалі сачыць за чыстатой. Кожны дзень мыем падлогі, праветрываем пакоі.

Не так даўно на агульным жаночым сходзе калгасніцы гаварылі пра шмат якія недахопы ў рабоце ясляў, асабліва скардзіліся на дрэнны догляд дзяцей з боку няняк. Каб пазоавіцца гэтага, на другі-ж дзень была ліквідавана абязлічка ў доглядзе дзяцей шляхам замацавання за кожнай нянькай групы дзяцей. Я упэўнена, што нашы яслі будуць не на апошнім месцы ў конкурсе на лепшыя бытавыя ўстановы.

Загадчыца ясляў
Соня Люхтэр.

Лепельскі раён.

Лепш забяспечваць яслі

Па Глускаму раёну адчынена 42 дзіцячых ясляў. Але якасць работы ў яслях зусім дрэнная. Слаба падрыхтаваны кадры. Горш за ўсё абстаіць справа ў совгаскіх яслях. Галоўнае, кепска з забеспячэннем. Дырэктары совгасаў, усе як адзін, дадумаліся не даваць ніводнага літра малака для ясляў, а толькі па пару літраў перагона на 25 дзяцей, спасылаючыся на тое, што планы здачы малака вялікія, або Наркомсовгасаў не дазваляе. Няўжо-ж гэта там?

За такую практыку дырэктары совгасаў павінны атрымаць па заслугах. Клімчык.



Дзіцячыя яслі ў калгасе „Перамога" Калодзішчанскага с-с (Менскі раён).

ПЕРАДАВЫЯ ЎДАРНІЦЫ ТРАНСПАРТА, ПАВЯДЗІЦЕ ЗА САБОЙ АДСТАЮЧЫХ НА БАРАЦЬБУ ЗА РАШЭННЕ ЦК І СНК

Чарняўская Дуня—камандзір руху



Золак. Праз развеянную ветрам ноч зусім выразна вызначаюцца абрысы сэмафораў і вагонаў. Тысячы пасажыраў запаўняюць Аршанскі вакзал і кожны з іх кудысці спяшаецца.

Дуня на сваім адказным месцы за поўгадзіны раней патрэбнага тэрміну. Яна ведае, што самае невялікае яе спазненне выклікае затрымку цягнікоў пры адпраўленні, адгэтуль будуць прастоі іх па ўсёй лініі, пробка, што вельмі балюча адбіваецца на ўсёй народнай гаспадарцы краіны.

Ад чорнарабочай, рассыльной, праз 10-месячныя курсы Дуня прышла да пасады дзяжурнай па станцыі. На 80-м 82-89-533-м кілометры, Орша — Заходняя, Орша — цэнтральная, усюды ведаюць старанную, акуратную дзяўчыну ў чырвонай шапцы — дзяжурнага па станцыі. За ўдарную, добрасумленную работу, за паспяховае аўладанне тэхнікай эксплоатацыі яе зараз вылучылі на вельмі кваліфікаваную работу — дзяжурным цэнтралізаванага, распарадчага паста.

На Дуню, як камандзіра руху Аршанскага вузла, ускладзена адказнейшая задача. Без яе дазволу не прымаюць і не адпраўляюць ніводнага цягніка. Праз кожныя 20—30 хвілін прыбываюць і адпраўляюцца з Оршы цягнікі. Работа вельмі адказная, напружаная, трэба думаць на-ляту, ды і мала думаць, трэба яшчэ і ведаць справу. І т. Чарняўская кіруе.

Яна не мае ніводнай заўвагі, ніводнай затрымкі цягнікоў, ніводнага спозненага адпраўлення. Не дарма-ж яе прэміявалі тры разы за ўдарную работу. Першы раз яе прэміявалі ў час правядзення конкурса спараных брыгад 150 р. грашыма за выключна ўважлівыя адносіны да работы, за добрыя вынікі яе, а два разы прэміявала адміністрацыя.

Дуня лічыцца на вузле лепшай ударніцай, прыкладнай дзяжурнай па станцыі. Зараз яна выклікала на сацспаборніцтва дзяжурную па станцыі Лебедзяву па пытаннях хутчэйшай адпраўкі цягнікоў, лепшай пагрузцы, выгрузцы, своечасовай адцэпкі і прыцэпкі вагонаў. Дуня паспяхова выконвае сацдагавор.

— Люблю сваю работу, даражу ёй,—кажа Дуня. Адзіная мая зараз думка і імкненне — гэта павысіць сваю кваліфікацыю, тэхнічную пісьменнасць у галіне эксплоатацыі. Яшчэ я вельмі хачу стаць дыспэтчарам, і я ім буду абавязкова.

Дуня мае рацыю.

Кожны дзень растуць сацыялістычныя кадры транспарта якія па-большэвіцку змагаюцца за яго перабудову.

Вялікае месца ў гэтай барацьбе займаюць такія жанчыны, як Дуня Чарняўская.

Камісарава.

Ст. Орша МБВ

ТАВАРЫШ ГАПАВА—ЛЕПШЫ ТЭХНІК І ЖАНОРГ ДЭПО

У левым вуглу мяккі дыван, столік і тут жа партрэты правадыроў. Правей крыху люстра.

На вокнах, засланых чысценькай паперай, у вазонах расцвіталі бутонамі кветкі, аганёк, мушкат і інш. напаўняючы прыемным пахам і ўтульнасцю мэханічны цэх Аршанскага дэпо.

Гэта надзвычай каштоўнае мерапрыемства. Азеляненне цэхаў было праведзена работніцамі і жонкамі рабочых, пад кіраўніцтвам цэхавага жанарганізатара Фені Гапавай.

Гапава Феня прышла ў дэпо адразу-ж пасля сканчэння чыгуначнай ФЗУ токарам па металу. За прыкладную работу і аўладанне тэхнікай такарнай справы яе хутка вылучаюць тэхнікам-нарміроўшчыкам дэпо. Зараз пад яе кіраўніцтвам працуе такарная, кузня, інструментальная, зварачны цэх.

Пасля перабудовы работы, паводле пастановы ЦК і СНК аб чыгуначным транспарце, з чатырох тэхнікаў дэпо, двух ня ўмеўшых нават і блізка падыйсці да рабочай масы, да канкрэтнага кіраўніцтва вытворчасцю знялі з работы. А Гапаву прэміявалі за ўдарную работу. У яе не было ніводнага прагула, пазнення, зрыва работы.

Вялізны аўтарытэт, заваяваны новым, маладым тэхнікам сярод рабочых, адміністрацыі і ў палітаддзеле, не выпадковы. 3-ці ўсесаюзны конкурс спараных брыгад ускалыхнуў усю грамадскасць дэпо. Пад кіраўніцтвам тав. Гапавай былі арганізаваны ўдарныя брыгады работніц і жонак рабочых для ўдзелу ў конкурсе. Брыгады ўзялі шэфства над паравозамі. Работніцы і жонкі рабочых удзельнічалі ў тэхнічным агляде паравозаў, а калі патрэбна было, то і самі чысцілі іх.

Аднойчы брыгада актыва хатніх гаспадынь з 10 чалавек самі сталі на кухні і прыгатавалі абед на 1500 блюд. Працавалі цэлую ноч. Затое абед вышаў з тых-жа прадуктах на дзіва смачнейшы, тлусцейшы і большыя порцыі. Асабліва актыўна сябе праявілі Панфіловіч, Лебедзева, Гусіна.

З гэтага часу і повар хоць і не ахвотна але пачаў падцягвацца, бо брыгада хатніх гаспадынь яго заўсёды кантралюе. Вось чаму маладога тэхніка Гапаву і хатнюю гаспадыню Панфілаву ўсесаюзны штаб па конкурсу на лепшую спарачную брыгаду прэміяваў—першую грашыма ў 200 руб., а другую ў 300.

Па рабоце маладога тэхніка актыўнага грамадскага работніка тав. Гапавай павінны раўняцца работнікі Аршанскага дэпо. Яна сапраўды павярнулася тварам да новых задач перабудовы транспарта, каб зрабіць яго адпаведным запатрабаванням сённяшняга дня.

Кунина.

Ст. Орша, М.-Б.-Б.

ЗМАГАЦЦА ЗА ЗДАРОВЫ ВАГОН

Брудныя вокны, на лаўках і на падлозе ў палец смецця, лаянка, склока і спекуляцыя—вось што панавала ў жаночай брыгадзе праваднікоў імя 8-га сакавіка.

Усе гэтыя агіднасьці ўзначальвала брыгадзір Труш, кандыдат партыі, якая часта сама гультаявала і, прыкідваючыся хворай, любіла, каб за яе рабілі другія.

Пасажыры заўсёды скардзіліся на гэты бруд, на неахайнасць праваднікоў, запісвалі ў кнігу скаргаў, але нічога не дапамагала. Недысцыплінаванасць, склочніцтва, раз'ядала брыгаду. Спазненні і нават нявыхады на работу сталі павялічвацца.

Аб спаборніцтве ніхто і не думаў, яно заключана было толькі дзесьці на паперы.

Як абухам па галаве стукнула разгільдзяеў пастанова ЦК і СНК аб перабудове работы чыгуначнага транспарту. Гультаям, рвачам, склочнікам, спэкулянтам была абвешчана рашучая вайна. Прагульшчыцу Кузіноўскую адразу знялі з работы. Камісія па чыстцы выявіла сапраўдны твар Труш і вычысціла з партыі.

Партарганізацыя малага рамонта паслала для ўмацавання работы брыгады двух комуністак. Туды-ж перакінулі лепшых ударніц з другіх брыгад. Тав. Казанцэвіч з 1930 года працуе праваднікам. Зіму працавала істапніцай, была ўдарніцай, мела ўдарную кніжку. Пасля слухачка курсаў праваднікоў. Добра вывучыла сыгналізацыю, атапленне, і інш. Скончыўшы курсы працавала праваднікам і парторгам курортных цягнікоў, а зараз парторг жаночай брыгады.

Трашчыла, былая хатняя работніца, член партыі з 1932 года. Калі прымацавалі яе да жаночай брыгады, яна адразу-ж рашуча пачала змагацца з спекуляцыяй, выявіла спекулянта Хлуса, які з Днепрапятроўска вазіў ў Менск гаршкі, а адсюль цукар.

Дудо — беспартыйная, сучасны прафорг брыгады, рэдактар насценнай газэты. Яна праз насценны друк жорстка бічуе недахопы, гультаёў, прагульшчыкаў, зрыўшчыкаў працоўнай дысцыпліны. Ударніцы Курдзюлава, Султанава, Будкевіч, Скабленко, Шыманец, Крайко актыўна дапамагаюць ім у гэтай перабудове.

— Атрымоўваецца, што брыгада нібы змяніла аблічча. Прапрацавалі пастанову, дысцыплінарны статут, заключылі індывідуальныя дагаворы, глядзім і людзі не тыя сталі,—расказвае т. Казанцэвіч. Адзін пасажыр нават у кнізе адзначыў узорную нашу чыстату і добрасумленнасць.

Работніцы пачалі змагацца за чыстату, прыкладнасць, дысцыплінаванасць у час паездак.

1) тав. Дудо, 2) тав. Казанцэвіч, 3) тав. Трашчыла.

Спытайцеся зараз пра брыгаду імя 8-га сакавіка і вам раскажуць пра яе, як пра лепшую брыгаду. Хоць і кароткі час прайшоў пасля перабудовы работы брыгады, але ўжо і за гэты кароткі час не зарэгістравана ніводнага спазнення на работу, стала ўзорнай чыстата ў вагонах і ў прыбіральні, своечасовая сыгналізацыя, добрае абыходжанне з пасажырамі, ліквідаваны былыя сваркі, якія шмат шкодзілі ў рабоце.

Работніцам прывілі навыкі свядомых адносін да сваіх абавязкаў. У час работы яны ўжо не толькі сочаць за сваімі непасрэднымі абавязкамі, а прыслухоўваюцца да кожнага няправільнага стуку пад вагонам.

Аб гэтым красамоўна гаворыць геройства праваднікі — ударніцы т. Скабленкі. У час работы т. Скабленка пачула нейкае незвычайнае, няправільнае гудзенне—пастукванне кола. Аказалася, што пад вагонам адарваўся тармазны вал. Калі-б цягнік дапусцілі да стрэлак, крушэнне былоб-б нямінучым. Але Скабленка адразу спахвацілася, яна стоп-кранам спыніла цягнік і гэтым выратавала тысячы людзей і шмат дабра. За гэта Скабленка атрымала грашовую ўзнагароду ў суме 117 р.

Г—а.

Ст. Менск.

Голад у вёсках фашысцкай Польшчы

У апошнія часы фашысцкая прэса Польшчы, Нямеччыны, а асабліва дэфензыўныя газэткі беларускіх і украінскіх нацыянал-фашыстаў вядуць самае агіднае, самае дзікае цкаванне Савецкага саюза. Якія толькі небыліцы не выдумваюцца пра пролетарскую дзяржаву.

У чым справа? Чаму сёння так заядла выюць, асабліва пра голад у нашай краіне, розныя прадажныя пісакі і беларускія і украінскія прыказчыкі польскага капітала, гэтыя агенты польскай дэфензывы.

Як вядома СССР у сёлетнім годзе мае надзвычайны ўраджай. Многія сем'і калгаснікаў, нават паводле папярэдніх падлікаў, будуць мець па 200—300 і нават па 400 пудоў адных толькі збожжавых культур. Калгасы СССР пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі атрымалі новую вялізарную перамогу. Ці-ж можа буржуазія і яе прадажныя лёкаі, якія ўвесь час крычалі аб развале калгасаў, сказаць сёння праўду сваім працоўным пра калгасы і калгаснае жыццё?—Зразумела, што не!

Калі багаты сёлетні ўраджай ў СССР дае магчымасць новага палепшання быта шырокіх працоўных мас, дык у Польшчы нават сярэдні ўраджай гэтага года з'яўляецца няшчасцем для шырокіх мас працоунага сялянства.

200—300—400 пудоў збожжа, якое атрымае калгаснік СССР, з'яўляецца яго ўласнасцю, з якою калгаснік мае права рабіць, што хоча.

А ў Польшчы і асабліва ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, яшчэ не паспеў селянін зжаць збожжа, як на яго насядаюць розныя капіталістычныя п'яўкі. Як падае фашысцкая прэса, у Заходняй Беларусі падатковыя экзекутары за неўзнос падаткаў забіраюць збожжа з поля, апячатваюць гумны. Таму нічога дзіўнага, што сялянства ў Польшчы стараецца хаця-б за бясцэнак што-небудзь прадаць, пакуль не забярэ экзекутар. З прычыны гэтага цэны на хлеб гэтай восенню ўпалі да нябывалых памераў—да 1 зл. за пуд, што дарэшты руйнуе сялянства.

Пры дапамозе паліцыі экзекутары выціскаюць з селяніна апошнія сокі, забіраюць апошняе дабро, апошнюю карову. З году ў год, нават з месяца ў месяц, растуць падаткі і ўводзяцца ўсё новыя шарварачныя, рагатковыя, вайсковыя і г. д.

Усе гэтыя вялізарныя сродкі, якія здзіраюцца з працоўных мас, ідуць на ўзбраенне, на пашырэнне і ўтрыманне апарата фашысцкай дыктатуры, на барацьбу супроць рэволюцыйнага руху, на душэнне нацыянальна - вызваленчай барацьбы працоўных Зах. Беларусі і Зах. Украіны.

З другога боку, усякі раз, калі атмосфера ў краіне накаляецца да бела, калі буржуазія дрыжыць ад страху перад надыходзячай пролетарскай рэволюцыяй,—яна распачынае антысовецкую кампанію, каб адцягнуць увагу мас ад унутранога становішча краю, адцягнуць іх ад рэволюцыйнай барацьбы, з-пад уплываў кампартыі, якія растуць з кожным днём.

А што ўнутранае становішча фашысцкай Польшчы катастрафічнае, то гэтага не можа скрыць нават і сама фашысцкая прэса, не гледзячы на строгую цэнзуру. Польская, а асабліва Заходняя Беларуская вёска, не гаворачы ўжо пра сотні тысяч беспрацоўных у гарадох—галадае.

Нават фашысцкая прэса піша аб катастрафічным становішчы польскай вёскі, а галоўнае—б'е трывогу аб узмацненні рэволюцыйнага руху, аб узмацненні на вёсцы ўплываў кампартыі.

Так, кулацкі „Зялёны штандар" у № 23 вясною пісаў:

„паўвёскі ніколі-ніколі не піло ні кавы ні гарбаты, амаль ніхто там не ведае ўжывання цукру... Жывуць, як сабакі, харчуючыся вадзяністым супам і кіслым хлебам. Людзі паміраюць там як мухі, без доктарскай дапамогі. Вось малюнак сучаснай польскай вёскі".

Калі такое становішча карэннай польскай вёскі, то аб Заходняй беларускай вёсцы не прыходзіцца і гаварыць. Заходня-беларуская вёска літаральна галадае. Вясною беларуская радыкальная газэта „Барацьба" пісала:

„З усіх куткоў Заходняй Беларусі даходзяць грозныя весткі аб голадзе. Недаяданне працоўных мас у Заходняй Беларусі за апошнія гады з'яўляецца сыстэматычным з'явішчам. Хлеба хапае не больш, як да каляд. Неўраджай у леташнім годзе быў асабліва востры. У большасці паветаў нават насенне не вярнулася. Голад распачаўся ўжо з восені. На грунце голаду страшэнна пашыраюцца эпідэміі розных заразлівых хвароб. Тыфусам ахоплены цэлыя вёскі на Палессі і Віленшчыне. Людзі паміраюць, як мухі. Уся „ратаўнічая кампанія" фашысцкага ўрада зводзіцца да высылання ў ахопленыя голадам і эпідэміяй раёны ўзмоцненых паліцэйскіх атрадаў, каб не дапусціць да бунтаў, каб ахоўваць абшарніцкія свірны ад галадаючых".

Прычыны голаду ў Зах. Беларусі заключаюцца ў страшэнным збядненні асноўных мас сялянства ў выніку акупанцкага грабяжа і абшарніцкай эксплоатацыі. Пагаршаецца апрацоўка зямлі, не хапае на сяўбу насення. У гэтым прычына сістэматычнага змяншэння ўраджайнасці, у гэтым прычына хранічнага голада на Зах. Беларусі, які з году ў год павялічваецца.

Сяляне пухнуць з голада, ядуць мякіну, кару, а ў гэты час абшарнікі і кулакі ломяць сабе галаву, куды падзець вялізарныя запасы збожжа, бо збяднеўшыя масы рабочых і сялян не маюць за што купляць гэты хлеб.

Голад пашыраецца на Віленшчыне, Гарадзеншчыне, Палессі.

Зараз працоўныя масы Заходняй Беларусі і Польшчы дачакаліся новага ўраджаю. У шмат якіх мясцох сяляне жалі жыта яшчэ зялёнае, сушылі яго і з такога недаспеўшага збожжа пяклі хлеб, каб толькі паесці. Аб тым, з якой нецярплівасцю чакалі сяляне Зах. Беларусі новага ўраджаю, і вымушаны былі жаць яшчэ зусім зялёнае жыта на хлеб—красамоўна сведчыць урадавы „Кур'ер Віленскі" ад 9 жніўня. У допісе гаворыцца:

„Некаторыя бедныя земляробы ўжо звыш 2-х тыдняў ядуць новы хлеб. Трэба было сушыць збожжа, бо яно было недаспелае і мяккае, хлеб з такога збожжа не смачны. Але лепш такі, чым нічога для таго, хто ад вялікадня не еў хлеба, бо свайго не меў, а купіць не было за што. Толькі цяпер насыцяцца. Перад гэтым працаваў паўгалодны, бо да супу з крапівы і шчаў'я, або свірепы, да тройцы меў толькі бульбу, а потым хлябаў „поліўку", гэта значыць ваду, зафарбаваную ячменнай мукою, без хлеба і без бульбы".

Абшарніцкія свірны трашчаць ад запасаў збожжа, яны за бясцэнак вывозяць яго за межы, атрымліваючы за гэта прэміі ад дзяржавы, на дзяржаўных складах гніюць мільёны пуд. збожжа

закупленага казной у тых-жа абшарнікаў,—а па гарадах і па вёсках сотні тысяч беспрацоўных галадаюць, паміраюць галоднай смерцю. На глебе беспрацоуя і голада здараюцца ўсе больш частыя выпадкі самагубстваў як у горадзе, так і ў вёсцы. Але канчаюць самагубствам толькі адзінкі, выбітыя з каляіны жыцця. Масы-ж беспрацоўных, разам з працуючымі рабочымі, пад кіраўніцтвам слаўнай комуністычнай партыі, вядуць не на жыццё, а на смерць зацятую барацьбу супроць капітала, супроць фашысцкай дыктатуры, за лепшую будучыню. Па ўсёй краіне грознай хваляй праносяцца забастоўкі. Ад пролетарыяту не адстаюць і працоўныя сялянскія масы. У ліпені, даведзенае да галечы сялянства 12-ці паветаў Кракаускага і Львоўскага ваяводзтваў падняло паустанне. Прычынаю паустання—масавы адпор сялян сцягванню падаткаў. У вёсцы Казоджа на экзекутара напалі сяляне, цяжка збілі яго і адабралі награбленыя ў час экзекуцыі грошы. Экзекутар вярнууся назад з паліцыяй. Але паліцыя была абязброена сялянамі. Сяляне разаслалі ва ўсе канцы ганцоў, заклікаючы на дапамогу ваколічныя вёскі. Пачалі збірацца сяляне з самых далёкіх вёсак па некалькі тысяч. На месца падзей прыбыла мясцовая ўлада. Намеснік ваяводы, староста, начальнік беспячэнства і іншыя. Сяляне абкружылі аўтамабіль намесніка ваяводы і перарэзалі нажамі ўсе шыны. Паліцыя не адважылася падыйсці оліжэй. Гэтыя падзеі ў Казоджы працягваліся 2—3 дні і знайшлі вялізарны водгук ва ўсіх ваколічных вёсках. Яны выклікалі моцнае ажыўленне сярод сялянскіх мас ва ўсіх ваколічных паветах. 5 чэрвеня ў вёску Петшэва каля Ропчыц прыбыло звыш 40 тысяч сялян, напр. з Ланцут, Кольоушэва, Ніско і інш. Мястэчкі Ропчыца і Сэндзішаў былі захоплены ўзбунтаваўшай масай. Старшыню ў Сэндышаве сяляне выцягнулі з кватэры і прымусілі ісці на чале дэманстрацыі з паднятымі уверх рукамі і крычаць: „Няхай жыве рабоча-сялянскі урад". Аптэка, якая належыла мясцоваму кулаку і некалькі крамаў мясцовых фашыстаў, былі разгромлены. Гэтыя падзеі працягваліся 4 дні.

Паліцыя не раз імкнулася разагнаць паўстаўшых сялян, але заўседы яе праганялі з вялікімі для яе стратамі. Для здушэння паўстання ўрадам былі кінуты вялізарныя вайсковыя і паліцэйскія сілы. Паміж паліцыяй і сялянскімі масамі адбываліся фармальныя баі, у выніку якіх былі забітыя і параненыя з абодвух бакоў. 2 вёскі былі ўзяты вайсковым штурмам. Сялянства паўцякала ў лясы. У час баёў з паліцыяй і войскам было забіта 40 сялян, 13 паліцэйскіх і камендант паліцыі. У часе паўстання сяляне арганізаваным парадкам захоплівалі абшарніцкае дабро і жывёлу, праводзілі масавае высяканне казённых і абшарніцкіх лясоў, праганялі прадстаўнікоў улады, разбройвалі паліцыю.

Характэрна, што калі ў час паўстання ў Ропчыцах сяляне разаслалі сваіх ганцоў нават у іншыя паветы з заклікам аб дапамозе, то ў Жэшоўскі павет прыехаў селянін, заклікаючы ўсіх ісці ў Ропчыцы, бо там рэволюцыя. Сяляне са Страніцтва Людовага, сустракаючы комуністаў, якія растлумачвалі за што трэба змагацца, адказвалі: мы таксама комуністы, бо хочам таго-ж самага і за гэтае самае змагаемся". У час гутарак сяляне давалі абяцанне адзін другому дапамагаць у выпадку нападу паліцыі.

Кракаўскае паўстанне ўскалыхнула шырокія масы сялянства ва ўсёй Польшчы. Па прыкладу сялян ропчыцкага і іншых паветаў, у абарону сваёй маёмасці ад падатковага грабяжу, паўсталі сяляне некалькіх валасцей Кобрынскага павета. Польскі фашызм крывава расправіўся над паўстаўшымі сялянамі ў Ропчыцах і Кобрынскім павеце. Сотні сялян кінута ў турмы, а ў Кобрыне 8 сялян і адна жанчына Каплан былі адданы ваенна-палявому суду. Толькі пратэст шырокіх працоўных мас Польшчы і Зах. Беларусі выратаваў іх ад шыбеніц і яны асуджаны на вечную катаргу.

Сялянскія паўстанні былі варожа сустрэнуты ўсімі польскімі буржуазнымі партыямі, ад урадавай партыі і эндэцыі да Строніцтва і ППС уключна.

Толькі комуністычная партыя Польшчы ад самага пачатку да канца падтрымала гэтую геройскую барацьбу сялянства, арганізоўвала яе і пашырала, мабілізуючы на дапамогу сялянам рабочы клас і працоўныя масы ўсёй Польшчы.

Сялянскае паўстанне у Кракаўскім, Львоўскім ваяводзтвах і ў Кобрыншчыне адбылося на фоне гіганцкай забастовачнай барацьбы польскага пролетарыята. Не гледзячы на шалёны белы тэрор, на карныя экспедыцыі, ваенна-палявыя суды і шыбеніцы, рэволюцыйны рух пашыраецца і ўзмацняецца. Растуць уплывы комуністычнай партыі. Поспехі-ж Совецкага саюза ў будаўніцтве соцыялізму натхняюць працоўныя масы Зах. Беларусі і Польшчы веру ў свае сілы, даюць ім энергію ў іх геройскай рэволюцыйнай барацьбе за звяржэнне фашызма, у барацьбе за рабоча-сялянскі ўрад, за Совецкую Польшчу.

Апошнія падзеі ў Польшчы — забастовачная хваля, якая трасе фундамант фашысцкай дыктатуры, і апошнія сялянскія паўстанні ў Кракаўскім, Львоўскім ваяводзтвах і ў Кобрыншчыне (на З. Б.), якія адбыліся на фоне гіганцкай забастовачнай барацьбы польскага пролетарыята, сведчаць, якімі шпаркімі крокамі набліжаецца Польшча да рэволюцыйнага крызіса.

С. Ж.

Кватэра аднаго бэрлінскага рабочага, пасля „наведвання" яе штурмавікамі.

Выкананне пастановы партыі аб забеспячэнні бескароўных калгаснікаў каровамі—крок да заможнасці калгаснікаў

Лепшай ударніцы Мілін Ядзі далі цёлку

У нашым калгасе „Чырвоная Беларусь", Навасадцкага сельсавета, пасля прапрацоўкі пастановы партыі і ўрада аб дапамозе бескароўным сталі абмяркоўваць, каму з бескароўных аказаць дапамогу ў першую чаргу.

Усяго ў нашым калгасе—7 бескароўных. Пасля падрабязнага абмеркавання кожнага з іх як ён працуе, ці з'яўляецца ударнікам, ці меў раней карову, парашылі даць у першую чаргу цёлак з калгаснай фермы Мілін Ядвізе і Смірнову Фядоту.

Мілін Ядвіга сапраўды лепшая з лепшых у калгасе. Яна 12 кароў доіць і 12 цялят даглядае. Пры ёй павялічыўся ўдой малака і добра дагледжаны цяляты.

Калгаснікі і калгасніцы на сходзе пастанавілі даць ёй цёлку ў прэмію за добрую работу.

Смірноў Фядот таксама лепшы ўдарнік, які зараз пастаўлен на работу вартаўніка жыта.

Для дапамогі астатнім бескароўным праўленне калгаса пастанавіла купіць цёлак у аднаасобнікаў і калгаснікаў, якія маюць кароў.

Брыгада калгасніц:
Юцкевіч Зося,
Дарашкевіч Юзэфа
Юцкевіч Ганна.

Дзяржынскі раён.

Ударнікам ў першую чаргу

Шырока абмеркавалі калгасніцы і калгаснікі калгаса „Чырвоная ніва", Ляхавіцкага сельсавета, пастанову партыі і ўрада аб дапамозе бескароўным. Спачатку на звеннях, у брыгадах, на праўленні, а пасля на агульным сходзе калгаснікаў.

У першую чаргу вызначылі даць цёлкі 4 бескароўным, самым лепшым ударнікам. Сярод іх Хмялеўскай—аратаму і конюху.

Тут-жа на сходзе калгаснікі Меляшкевіч, Хадасевіч, Янушкевіч, Тамашкевіч, якія маюць цельных кароў, абавязаліся прадаць цёлак калгасу для бескароўных.

Гоянкова.

Дзяржынскі раён.

Дзякуючы яслям не адстаю ў працы

У калгасе „Чырвоная ніва", Ляхаўскага сельсавету, ёсць яслі-пляцоўка на 25 дзяцей, з іх 6 груднякоў. Абслугоўваюць яслі 3 чалавека.

Калгаснікі гэтага калгасу жывуць вельмі раскідана, многім далёка ад ясляй. Гэта ўлічыла новая загадчыца ясляй Булынка Маня (свая-ж калгасніца), якая з'арганізавала прывозку дзяцей у яслі. Праўленне дала каня.

Штодзенна ледзь узыйдзе сонца Булынка аб'яжджае ўсіх калгаснікаў, якія маюць малых дзяцей і адвозіць іх у яслі, а назад іх прывозіць тады, калі ўжо цёмна.

Харчаванне ў нас добрае. Частку дае калгас, а маткі дадаюць яшчэ яек і малака. Ёсць і манна і цукар. У яслях заўсёды чыста.

Дзеці задаволены яслямі і любяць туды хадзіць.

Дзякуючы добрай наладжанай працы ясляй у нас усе жанчыны працуюць.

— У мяне чацьвера дзяцей і я ўвесь час працавала, бо трое малых знаходзіліся ў яслях, а адзін—школьнік.

Клочка Зося.

Дзяржынскі раён.

Тацяна-ўдарніца атрымала цёлку

Лёгкая кавалерыя комсамольскай ячэйкі калгаса „Новае жыццё", Свяцкага сельсовета, праверыла, як ажыццяўляецца пастанова партыі аб забеспячэнні каровамі бескароўных калгаснікаў.

У калгасе есць усяго 5 бескароўных. Праўленне пастанавіла ў першую чаргу забяспечыць лепшых ударнікаў бескароўных Тацяну Дземка і Фёдара Дземка. Так і зроблена было. Яны атрымалі цёлак з калгаснага стада. Дзве цёлкі праўленне закантрактавала, адну ў аднаасобніка, а другую ў калгасніка.

Змітрачэнка, Раманаў, Шалкоўскі.

Лепельскі р.

Развалілі дзетпляцоўку

У мэтах своечасовага і поўнага выканання ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній сёлета ў калгасе „Чырвоная зорка", Тальскага сельсовета, была адчынена дзетпляцоўка. Праўленне адчыніла, але забылася аб ёй. Нават не падумала аб забеспячэнні пляцоўкі адпаведным памяшканнем і абсталяваннем. Арганізаваная для гэтай мэты камісія нічога не рабіла.

Прысланая РайАНА загадчыца пляцоўкі Шэйхман Хана сваёй бяздзейнасцю разваліла пляцоўку і сама ўцякла.

Цікава запытацца ў праўлення, якія меры яно прыняло, каб захаваць пляцоўку і даць магчымасць жанчынам працаваць на полі.

Алесь Шпакоўскі.

Любанскі р.

Перадавікі—ударніцы

Калгас „Вольная праца", Росна-Селецкага сельсавету да 26 жніўня ўбраў з поля ўвесь лён. Ударніцы ўборачнай не здаюць тэмпаў працы і пры расціле лёну. Кучынская Наста, Мешаева Мар'я, Кучынская Мар'я, Шацкая Ганна расцілаюць у дзень па 10 коп замест планавых сямі.

На 1 жніўня абмалочана і разаслана ўсяго 400 коп або 70 проц. усяго лёну.

Светач.

Лепельскі раён.

Своечасова падрыхтуем кармы і памяшканні для зімоўкі жывёлы

Зусім знішчылі адыход

Наша ферма невялікая, усяго свінога пагалоўя мае 77 штук. Увосень мінулага года ў нас было толькі 14 свінаматак, з гэтага мы і пачалі будаваць свінаферму. У сваёй працы я скарыстаў вопыт догляда свіней, які набыў у Германіі, будучы там у палоне.

14 свінаматак паступілі да нас на ферму зусім схудалыя. Па-асобных прыходзілася прыносіць з поля. Нават не было надзеі, што выжывуць. Я паставіў сабе мэтай паставіць усіх 14 на ногі і дабіцца добрага прыплода. Гэтага я дабіўся. На працягу 6 месяцаў ферма дала прыроста 63 штукі маладняка ад 10 свінаматак. Ніводнае парасё не загінула. Я раскажу, як я гэтага дабіўся.

— Пачаў я з парадку на самой ферме. Хлеў быў стары, дзіравы. Мы яго ўцяплілі — пазатыкалі дзіркі сенам, зрабілі столь з жэрдак і саломы. Палажылі ў хлеве падлогу і зрабілі стокі для макраты. Станкі і карыты кожны дзень чысцілі. Карміць пачалі па нормах. Выпрацавалі правілы ўнутранага распарадка на ферме — калі свіней трэба чысціць, калі карміць і гэтыя правілы вывесілі на ферме.

Завялі строгі ўлік злучкі, каб ведаць час апароса. Над кожнай загарадкай свінаматкі вісіць дошчачка, на якой запісан узрост свінаматкі і час злучкі. У час апаросу ў нас былі ўстаноўлены дзяжурствы. Ніводная матка не апарасілася без догляду, бо апарос—гэта вельмі сур'ёзная справа. Калі не дагледзіш, то парасяты вылязуць з цёплага гнязда, памерзнуць і будуць гінуць.

Але догляда пры апаросе яшчэ мала, — каб выгадаваць добры маладняк патрэбен правільны догляд за малымі парасяткамі. Кармілі мы малых заціркай з малаком, а калі не елі зацірки, то варылі бульбу, пераціралі і бялілі малаком, давалі і вугалле. Улетку для парасят зрабілі сталоўку на свежым паветры на двары. Зараз на нашых парасят люба паглядзець.

Мы ўжо распачалі падрыхтоўку да зімы. Складзен кармавы баланс з разлікам на кожную дароелую свінню—4 кгр. бульбы і 200 грам мукі і на маладых 3 кгр. бульбы, 300 грам мукі. Акрамя гэтага даем і кораньплоды.

Т. Ганчарова—свінарка калгасу „Чырвоны Профінтэрн", прэмірованая парасёнкам за ўдарную работу. (Бранскі раён, Западной обласці).

Падшукалі асобнае памяшканне для зімоўкі маладняка з былых кулацкіх будынкаў.

Чакаем яшчэ трох апаросаў і думаем іх захаваць поўнасцю, як захавалі і папярэднія. На ферме працуем утрох — я і дзве свінаркі. Мы выклікалі на сацспаборніцтва суседнюю ферму калгаса „Кастрычніцкая рэволюцыя",—там справа абстаіць не зусім добра з доглядам, свінні знаходзяцца ў дрэнным становішчы. Мы свой вопыт барацьбы за захаваньне моладняка абавязкова пастараемся перадаць ім.

Загадчык СТКФ, калгасу
„Краіна Саветаў"
Г. Чуліцкі.

Менскі раён.

Жанчыны—барацьбіты за сілас

Жанчыны калгаса „Вольная праца", Роска-сялецкага сельсавета, па-баявому змагаюцца за сіласаванне кармоў. У чэрвені месяцы, па ініцыятыве жанчын, была закладзена сіласная яма ў 30 тон. У верасні месяцы закладзена другая яма—20 тон сіласа. У час закладкі другой ямы жанчыны таксама паказвалі ўзоры барацьбы за тэмпы і якасць працы. Асабліва актыўна змагаліся за сіласаванне Кучынская Наста, Кучынская Тацяна і Камленка Вера. Акрамя гэтага калгас ставіць сваёй мэтай засіласаваць 50 тон бульбяніку.

Усе калгасніцы Роска-Сялецкага сельсавета павінны ўзяць прыклад з калгасніц калгаса „Вольная праца" і ўключыцца ў барацьбу за сілас.

Светач.

Аршанскі р.

Скірды хлеба і корму ў калгасе „Соц. вэг". Парыцкі раён.

Ганна Сапрыка

Будзем заможнымі

Вечар нячутна
на землю сыходзіў,
Водблеск зары
фарбаваў плот.
Каля праўлення
Міхась брыгадзір
праводзіў калгаснікаў сход.
Тут пасля працы
сышліся яны
дазорнаму здаўшы
вучасткі на ноч.
Сходам кіруе
Ліпай машыніст,
ён на жняярцы працуе даўно.
У брыгадзіра,
бы тая рака,
ллецца струмень
простых слоў.
Ён гаворыць
пра пастанову ЦК,
Ён гаворыць
пра кароў.
Ён гаворыць:
— Яшчэ адзін крок,
і калгаснікі
стануць заможнымі.
Загарэлася лямпа
асвятляючы змрок.
вецер шугнуў
над пожнямі...
Вочы з запалам
ва ўсіх гараць,
на ляту хапаюць словы,
у гэтай брыгадзе
калгаснікаў пяць
да гэтуль ня мелі каровы.

* * *

Зорны вечар
чамусці ядраны,
пагодная будзе раніца...
Ля прызбы
стаіць радая
сёння Матруна ўдарніца.
Касынка
з'ехала на плячо,
У валасох заблытаўся вецер,
а радасць,
радасць у сініх вачох,
бы сонца другое свеціць.
Матруна
калгасную радасць
тваю апісаць
хто зможа?
Яна з'яла тады,
як сустрэлі брыгаду
палі буйным коласам збожжа.
Яна з'яла тады,
як за хуткай жняяркай
снапы ўмалотныя клаліся
і ў след іх вязалі
шпаркія
загарэлыя рукі калгасніц.
Яна з'яла тады,
як апошні колас
з ураджайных загонаў,
быў звезены,
як гула малатарня
шасцернямі—коламі,
глытаючы збожжа
пасткай жалезнаю.
Малатарня грымела
ноччу, позна,
праца кіпела да раніцы,
а на заўтра
ехалі чырвоным абозам.
Наперадзе Матруна ўдарніца.
Развіваўся
чырвоны сцяг спераду,
аркестрам вітаў горад..
І за збожжа
сухое, буйное, спелае
атрымалі квітанцыю
першую—гонар.
І цяпер яна з'яе
радасць калгасная.
І цяпер яна
промнямі свеціць.
Вось спісы ляжаць
на стале бялёсыя,
залітыя лямпы святлом.
Іх толькі што
брыгадзір прачытаў.
Ад кожнага слова
сэрца білася...
Матруна дагэтуль
у калгасе адна
трыста шэсць працадзён
зарабіла.
Яна лепшай ударніцай
ў спісу стаіць,
і сход падцвярджае
брыгадзіравы словы:
Матруне ўдарніцы першай з усіх,
Матруне ўдарніцы—
даць карову...
І сэрца б'ецца,
б'ецца мацней.
Яна мае карову,
мае збожжа,
ведае—
галечы, бядоце канец,
Заўтрашні дзень не трывожыць.
Ведае—
болей ня пойдзе яна
на кулака
працаваць ніколі
да старога звароту
болей няма.
Яно прыбіта
асінавым колам.
Перад ёю адчынены
просты шлях
жыцця сапраўднага,
новага,
Ён яшчэ раз паказаны
ў дужых словах
гэтае пастановы.
Гэтым шляхам
міл'ёны ідуць,
працоўных міл'ёны крочаць.
І таму сёння на сходцы тут
запалам гараць так вочы.

8-IX—33 г.
Калгас „Ленінскі шлях", Менск. р-ну.

Брыгада калгасніц за апрацоўкай каноплі (Мсціслаўшчына).

Кругласутачнай работай, шырокім разгортваннем соцспаборніцтва і ўдарніцтва, поўным скарыстаннем машын — забяспечым здачу дзяржаве ў тэрмін добраякаснага ільнавалакна

ВЫКЛІКАЕМ ДЭЛЕГАТАК КАЛГАСА „КОМІНТЭРН“

Лён у нашым калгасе—вядучая культура. Засеялі мы яго 228 *га* і ўбралі ў ранняй жоўтай спеласці.

У час дажджу мы звозім лён пад павеці і пад стрэхі, дзе ён прасыхае. Дэлегаткі з'яўляліся лепшымі ўдарніцамі ў час цераблення. Вырывалі па 21 сотцы, замест нормы—11 сотак.

Трэцяя брыгада ў нашым калгасе з'яўляецца лепшай. Па ўсіх работах яна ідзе ўперадзе. Дзякуючы добраму кіраўніцтву з боку брыгадзіра працоўная дысцыпліна ў брыгадзе вельмі добрая. Ніводзін выпадак парушэння працоўнай дысцыпліны не застаецца не абмяркованым. Пільна сочыць брыгадзір за якасцю працы. Калі ў час ручнога абмалота ільна брыгадзір заўважыў, што некаторыя жанчыны дрэнна абіваюць, дык паасобным ён зрабіў заўвагі, а Барчук Фёклу, Маркоўскую Матруну, Велуцік Анэлю, Мурашка Аксінню і Папко Ганну па прапанове брыгадзіра пастанавілі аштрафаваць па тры працадні. Праўленне гэта рашэнне зацвердзіла. Тут-жа на таку ў час абмалота брыгадзір растлумачыў, што ад якасці апрацоўкі ільна залежыць яго нумарнасць, што той, хто дрэнна апрацоўвае—той шкодзіць сам сабе і ўсяму калгасу. Пасля гэтага выпадка дрэннай якасці абмалота не заўважалася.

Дэлегацкі сход пастанавіў выклікаць на соцспаборніцтва дэлегатак калгаса „Комінтэрн“, нашага сельсавета на перавыкананне норм па мяццю і трапанню, на арганізацыю кругласутачнай работы па апрацоўцы ільна і датэрміновую здачу дзяржаве.

Ёсць у нас яслі, але нянькі там дрэнна даглядаюць дзяцей. Дэлегаткі вылучылі камісію для агляда працы ясляй і ўстанавілі штодзённыя дзяжурствы матак.

Дэлегаткі пастанавілі прасіць рэдакцыю часопісі „Работніца і калгасніца Беларусі“ праверацъ ход спаборніцтва і асвятляць яго на старонках часопісі.

Сход абраў упаўнаважаных па часопісі ў кожнай брыгадзе. **У Губінскай брыгадзе Таню Кавецкую, у 4 брыгадзе—Барчук, 3—Мурашка, у 7—Варошка, у 1, 2 і 5—Беньенсон.**

Па даручэнні схода падпісалі: **Кавецкая Таня, Ладзік Каця.**

Лепельскі раён, к-с „Чырвоны сцяг“, Каменск. сельсавет.

Злёты ўдарніц апрацоўкі ільна

10 верасня ў Тумінскім сельсавеце, Аршанскага раёна, адбыўся злёт калгасніц-ударніц па апрацоўцы ільна, у якім прыняла ўдзел 42 калгасніцы.

У час падрыхтоўкі да злёта разгарнулася соцспаборніцтва на лепшую апрацоўку ільна сярод брыгад, звенняў і паасобных калгасніц.

Да злёта сельсоветам была арганізавана выстаўка ільняной прадукцыі.

На злёце калгас „Чырвоная змена“ выклікаў калгасы „Ударнік“ і „Барацьбіт“ на соцспаборніцтва па лепшай апрацоўцы і здачы ільна дзяржаве.

***

17 верасня ў горадзе Дзяржынску адбыўся раённы злёт калгасніц-ударніц, якія працуюць на ільне. З'явілася 42 калгасніцы з лепшых калгасаў раёна. „Ударнік 2“ і „Ударнік Совецкай Беларусі“ падзяліліся вопытам сваёй барацьбы за лён. На злёце прадстаўнік Загатільна паказаў, як трэба звязваць валакно.

На злёце адчувалася слаба праведзеная падрыхтоўка да яго на мясцох. Спрэчкі не былі досыць самакрытычнымі, у той час, як па раёне да злёта выцераблена ўсяго 65 проц. ільна. Гэта адзначыў начальнік палітаддзела МТС тав. Кроль, які выступіў на злёце. Тав. Кроль адзначыў таксама вельмі слабое вылучэнне жанчын на кіруючую работу (у раёне толькі 1 жанчына старшыня калгаса і зусім няма жанчын — брыгадзіраў паляводчых брыгад). Ён заклікаў да рашучага разгортвання крытыкі і самакрытыкі ўсіх недахопаў у рабоце, да ўдарнай работы па ўборцы, апрацоўцы і здачы ільна дзяржаве лепшай якасці, да своечасовай уборкі і здачы лепшай бульбы дзяржаве, да падрыхтоўкі да зімы жывёлы. Больш увагі аддаць дзіцячым установам.

Калгасніцы выказваліся аб тым, што неабходна зараз паклапаціцца аб стварэнні фондаў для дзіцячых устаноў, строга выконваючы дырэктыву партыі і ўрада аб засыпцы фондаў для патрэб калгасаў.

Дэлегаткі злёта абвясцілі сябе ўдарніцамі па лепшай апрацоўцы ільна і здачы добраякаснага ільна-валакна дзяржаве. **Н.**

НАЛАДЗІЛІ РАБОТУ МАШЫНЫ „ГІЛЬШТЭЙН“

Над калгасам „Комінтэрн“ (Каменскі сельсовет) вісела пагроза загнівання выцерабленага і не звезенага з поля ільна. Расцілаць з галоўкамі не можна, бо прападзе насенне з 300 *га* селекцыйнага ільна.

Калі мы атрымалі ад МТС машыну „Гільштэйн“, то аграном т. Данчанка і загадчык вучастка тав. Галовань папрабавалі на ёй ачос толькі падсушанага ільна і пасля ачоса $1^1/_2$ капы далі заключэнне, што машына працуе дрэнна, дае шмат „блытаніны“.

Па настаянню палітаддзела і РК была зроблена другая проба з вільготным лёнам і вынікі атрымаліся вельмі добрыя.

Убачыўшы добрыя вынікі работы машыны „Гільштэйн“, старшыня калгаса „Юг“ тав. Кляшторны адразу ўзяўся за ўстаноўку гэтай машыны.

Машыны „Гільштэйн“ павінны быць скарыстаны поўнасцю для абмалота сырога ільна. Гэта дасць магчымасць своечасова разаслаць лён і атрымаць лепшую якасць валакна.

В. Б.

Лепельскі раён.

Мабілізуем работніц і жонак рабочых на добраякасную ўборку ў каапгасах, на ахову ўраджая ад псавання і раскрадвання

Арганізацыі ўласнай харчовай базы на прадпрыемствах партыя і ўрад надае вялізарнае значэнне. Каапгас павінен стаць у рад з усімі цэхамі прадпрыемства. Ад правільнай і паспяховай работы гэтага цэху залежыць у значнай меры палепшанне забеспячэння прадуктамі харчавання рабочых.

Зараз каапгасы ўступілі ў самы адказны перыод сваіх работ—распачалася масавая ўборка. Гэты перыод патрабуе чоткай арганізацыі працы і шмат рабочай сілы. Без актыўнай дапамогі з боку саміх рабочых і работніц каапгасам цяжка справіцца з уборкай.

На радзе прадпрыемстваў БССР, дзе пытаннем уборкі ў каапгасе па-сапраўднаму заняліся і парткалектыў і прафарганізацыя, ёсць добрыя вынікі мабілізацыі мас рабочых і работніц на ўборачную кампанію.

Так, на заводзе імя Ланцуцкага (Гомель) 260 жонак рабочых далі сваю згоду і зараз працуюць штодзенна па ўборцы бульбы і гародніны.

Магілеўскія швэйнікі сістэматычна дапамагаюць сваёй прыгараднай гаспадарцы „Новы шлях" ва ўборцы.

Ніводнай хвіліны не траціцца дарэмна. Рабочыя і работніцы разбіваюцца на брыгады разам з рабочымі каапгаса, кожная брыгада атрымоўвае дзённае заданне выпрацоўкі.

Інакш справа абстаіць на торфзаводзе „Шлях да соцыялізма" (Гомель). Прыехаўшыя 150 рабочых і работніц для ўборкі бульбы замест работы збіраліся ў гурткі і спявалі, работа зрывалася з прычыны яе дрэннай арганізацыі.

Тав. Рудзенка—лепшая ўдарніца соўгаса „Найміцка Перамога" (Украіна) нясе буракі для завадскіх сталовак.

Не лепш абстаіць справа ў прыгараднай гаспадарцы Бабруйскага ЦРК. Плянаў уборкі няма. На прадпрыемствах не праведзена масавая работа сярод работніц і жонак рабочых па прыцягненню іх да ўборкі.

Кожны жанорг прадпрыемства павінен на цэхавых дэлегацкіх і агульных сходах работніц, на сходах жонак рабочых абмеркаваць пытанне ўборкі ў прыгараднай гаспадарцы. Выязды павінны быць распланаваны і загадзя ўзгоднены з каапгасам, каб забяспечыць правільную расстаноўку рабочай сілы ў час працы.

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР „аб плане забеспячэння бульбай гарадоў і асноўных прадпрыемстваў БССР на 1933-34 г." прадугледжвае значнае павышэнне норм забеспячэння рабочых бульбай у параўнанні з мінулым годам. Гэта забеспячэнне ў асноўным павінна ісці за кошт сваіх каапгасаў. І таму патрэбна усе сілы мабілізаваць на паспяховую ўборку ў каапгасах.

У гэтым годзе не будзе выдавацца ўся гадавая норма бульбы адразу на рукі. ЦК і СНК у сваёй пастанове ўказалі, што „практыка мінулых гадоў па механічным размеркаванні бульбы пайшчыкам—выдача адразу на рукі ўсёй гадавой нормы спрыяе лятунству на прадпрыемствах і ні ў якім разе не ўвязваецца з інтарэсамі вытворчасці". Гэта абавязвае партыйныя прафарганізацыі прадпрыемстваў арганізаваць правільнае захаванне яе на зіму і ахову ад раскрадвання.

Ужо зараз трэба праверыць, наколькі падрыхтаваны бульбахавальнікі, як падрыхтавана тара для засолкі і закваскі.

Кожная работніца, кожная жонка рабочага павінна ведаць, што ад паспяховай уборкі і захаванасці ўраджаю каапгасаў залежыць палепшанне забеспячэньня рабочых.

Менск. В. Кандратава.



Засолка гуркоў у каапгасе Гомельскага ТПО (злева) і на базе Белплодгародніны (справа).

1784/XII

Работніцы, у перадавыя рады барацьбітоў за першынство БССР ва ўсесаюзным фінансавым спаборніцтве



Тав. Грыгор'ева—хатняя гаспадыня жакту № 20 (Менск) падпісалася на пазыку на 50 руб.

11 верасня адбылася агульнагарадская канфэрэнцыя работніц і жонак рабочых гор. Менску, якая абгаварыла пытанне аб выкананні фінплана III квартала і аб арганізацыі рынкаў у горадзе Менску.

Пасля даклада намесніка Наркамфіна БССР тав. Ляхава разгарнуліся спрэчкі. Выказаліся т. т. Гуніна з абутковай фабрыкі, Самковіч з „Кастрычніка", Махліна з завода імя Варашылава, Суціна з друкарні імя Сталіна, Клучык—фабрыка імя Фрунзэ, Екельчык з фабрыкі імя Крупскай, Батвінік—„8-е сакавіка" і інш.

Канферэнцыя адзначыла, што на радзе прадпрыемстваў горада Менску слаба выконваецца фінплан, шмат ёсць рабочых і работніц, не ахопленых падпіскай на пазыку: на фабрыцы „Кастрычнік"—141 чалавек, на ЦЭЦ—237 чалавек.

Вельмі слаба праходзіць па горадзе збор пая. Па МГРК план па збору пая выканан толькі на 28 проц., па Гаржылсаюзу—на 33 проц., па ЗРК „Усход"—27 проц., абутковай—37 проц., імя Варашылава—32 проц. І гэта ў той час, як некаторыя ЗРК збор пая значна перавыканалі, так ЗРК ВСГШ, міліцыі, „Бальшавіка", „Камунарка" і інш. выканалі збор пая на 200—220 проц.

Дэлегаткі канферэнцыі абавязаліся прыняць актыўны ўдзел у барацьбе за першынство БССР па выкананні фінплана ва ўсесаюзным спаборніцтве. Кожная дэлегатка абавязалася павялічыць свае ўклады ў ашчадкасу не менш чым да 5 руб., павялічваючы гэту суму з месяца ў месяц. Завербаваць не менш 5 жанчын укладчыкамі ў ашчадкасу.

Разгарнуць падрыхтоўку да тыража пазыкі „І-га года другой пяцігодкі", які адбудзецца ў горадзе Менску. Высветліць і ахапіць падпіскай на пазыку ўсіх тых, хто яшчэ не падпісаўся да гэтага часу, як па фабрыках, арцелях, так і па жактах.



Тав. Рэміжэвіч (таварны цэх завода Мяснікова (Менск) падпісалася на пазыку на 150 руб. атрымлівае зарплаты 120 руб.

Да 18-га верасня ліквідаваць сваю квартальную запазычанасць па паявых узносах і шляхам шырокай растлумачальнай работы дабіцца ліквідацыі яе сярод работніц і рабочых свайго прадпрыемства і ў сваім жакце.

Дабіцца ад трохкутніка прадпрыемства своечасовай здачы ў дзяржаўную касу ўсіх зробленых вылічэнняў з рабочых і служачых.

Дэлегаткі абавязаліся шырока разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва па барацьбе за датэрміновае выкананне фінплана III квартала, за заваяванне першынства ў сацспаборніцтве з заходняй вобласцю, уцягнуўшы ў гэта спаборніцтва і падшэфныя калгасы.

Канферэнцыя выклікала працоўных жанчын горада Віцебска і Гомеля на соцспаборніцтва па выкананню фінплана III квартала.

Канферэнцыя вельмі ўважліва праслухала інфармацыю загадчыка камунальнай гаспадаркі горада Менску тав. Бумбата аб пабудове новага культурнага рынка на Віленскім пляцы і аб некаторай рэарганізацыі іншых рынкаў. На Віленскім рынку, будаўніцтва якога павінна быць закончана праз месяц, гандляваць будуць у зачыненых памяшканнях. Калгаснікі, якія будуць прывозіць свае тавары на конях, будуць ставіць коняй у спэцыяльна падрыхтаваных для гэтага будынках.

Шмат прапаноў унеслі дэлегаткі канферэнцыі па лепшай арганізацыі работы рынка, аб арганізацыі санкантроля за якасцю прадаваемай прадукцыі, аб вымошчванні дарогі і рыначнага плаца, аб устанаўленні дзяржаўнай вагі і шмат іншых.

Канферэнцыя дала новую заладку работніцам і працоўным жанчынам для барацьбы за фінплан, за культурны савецкі гандаль.

М-я.

Менск.

Тав. Альтшулер—хатняя гаспадыня жакта № 20 падпісалася на пазыку на 50 руб. (Менск).

Кошт асобнага нумару 10 кап.

1139

Парады агранома

ПОЎНАСЦЮ СКАРЫСТАЕМ БУЛЬБАКАПАЛКІ

Пачынаць уборку бульбы патрэбна па меры паспявання, ні ў якім разе не чакаючы агульнага паспявання і з такім разлікам, каб уся ўборка кончылася да 1 кастрычніка. Уборачны перыод не павінен расцягвацца больш 15—20 дзён.

Выбарка бульбы можа праводзіцца плугам і бульбакапалкамі. З усіх работ па культуры бульбы найбольш напруджанай з'яўляецца—уборка. На яе долю выпадае да 45 проц. ад усіх работ на бульбе. Таму трэба на ўборку яе як мага лепш і поўнасцю скарыстоўваць усе маючыяся машыны—бульбакапалкі, бо яны ў некалькі разоў павялічваюць вытворчасць працы супроць ручной уборкі.

Пры плужнай уборцы трэба на 1 *га*—2 коняй, 1 пахара і 20 выбіральшчыкаў, пры ўборцы бульбакапалкай сістэмы „Штоль" трэба на 1 *га*—3 коняй, пагоншчыкаў—1, падбіральшчыкаў—10—12 чалавек. Пры ўборцы бульбакапалкай „Чэмпіон" трэба адзін трактар, 6—8 падбіральшчыкаў.

Выходзячы з гэтага, ліпенскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б пастанавіў: папярэдзіць усіх дырэктароў МТС, саўгасаў і старшынь калгасаў, што невыстарчальнае выкарыстанне бульбакапалак у часе ўборкі бульбы будзе разглядацца, як супраціўленне мерапрыемствам па машынізацыі сельскай гаспадаркі.

З усіх відаў бульбакапалак лепшай — з'яўляецца „Штоль". Прынцып работы „Штоля" наступны: вялікі лямех у часе руху машыны ўперад падразае зямлю разам з кустамі бульбы, зямля скідаецца з лемеха з заду і выкідвае бульбу на паверхню зямлі. Чыстата ўборкі бульбы машынай сістэмы „Штоль" залежыць ад добрасумленнай падборкі яе пасля кожнага праходу машын прыбіральшчыцамі.

У часе працы трэба сачыць за рэгуляваннем лемеха на такую глыбіню, каб унікнуць рэзання бульбы. Вялікая глыбіна дарэмна перагружае машыну і не дае добрага адсевання бульбы ад зямлі. Рэгулюецца глубіна рычагом і стойкай лемеха на раме капальніка. Трэба, каб у часе работы машына была змазана і ўсе гайкі належным чынам прывінчаны. Для лепшай вытворчасці працы „Штоля" трэба выбіраць пагонныя барозны да 200—300 мэтраў. Тут вытворчасць працы яго бывае за дзень да 1,5 *га*.

З трактарных аднарадных бульбакапалак распаўсюджана машына элеватарнага тыпу — „Чэмпіён". Прынцып працы яе такі: падрэзаны пласт зямлі з кустамі бульбы паступае на элеватар, які сатрасаючыся прасяе зямлю і адрывае бульбіны ад батвы, якія коцяцца на элеватар. Прашоўшы элеватар бульба скідаецца ззаду ў радок, ці пападае на бульбападбіральнік. Прадукцыйнасць працы гэтай машыны за 8 гадзін—1,7 *га*.

Частка бульбы пасля праходу машыны (да 10 проц.) застаецца не выкінутай з зямлі, яе трэба выбаранаваць, а потым сабраць.

Пры ўборцы бульбы плугам заўсёды застаецца ў зямлі на рознай глыбіне да 17 цэнтнэраў бульбы на адным *га*. Для выбаркі гэтай бульбы трэба правесці баранаванне і пераворванне, як пасля бараны, так і пасля плуга—трэба акуратна наладзіць падбіранне бульбы. Толькі пры такіх умовах можна выбраць чыста бульбу з зямлі і пазбавіцца вялізарных страт.

Аграном Трыхуцік

У с ю зялёную масу бульбяніка скарыстаем на сілос

ЗДАВАЙЦЕ
ПАДПІСКУ
НА ЧАСОПІСЬ
РАБОТНІЦА і КАЛГАСНІЦА
БЕЛАРУСІ
ЛІСТАНОСЦАМ
АБО
НА ПОШТУ
ЧАСОПІСЬ
ВЫХОДЗІЦЬ
2 РАЗЫ
У МЕСЯЦ
КАШТУЕ 20 кап.
У МЕСЯЦ
АДРАС РЭДАКЦЫІ
МЕНСК, САВЕЦКАЯ 63,
3-І ПАВЕРХ, ПАКОЙ № 11.

Выданне ЦК КП(б)Б. Адк. рэдактар Э. ШАПІРА

Адрас рэдакцыі: Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, 11-ты пакой. Тэл. 22-415.

Здана ў набор 20-IX—33 г. Падпісана да друку 27-IX—33 г.

Друкарня імя Сталіна Заказ № 2086 У ліку 10.000 экз. Галоўлітбел № 1142

206618